**Генадзь Каханоўскі,**

**Аляксандар Каханоўскі**

# Руплівец нашай старасветчыны

*Яўстах Тышкевіч*

Мінск

Навукі і тэхніка

1992

## Як заклінанне, як малітва

Беларускія гісторыкі, этнографы, філолагі, фалькларысты даўно ўжо карыстаюцца пажоўклымі ад часу кнігамі-рарытэтамі і як даследчыкі судакранаюцца з рукапіснай спадчынай славутых вучоных Яўстаха і Канстанціна Тышкевічаў. Гэта яны, не зважаючы на свой высокі графскі тытул, бралі ў рукі рыдлёўкі і вялі раскопкі старажытных курганоў. Гэта яны здымалі з сябе сурдуты і апраналіся ў простае сялянскае адзенне, заходзілі ў хаты вясковай беднаты паслухаць шчырую гутарку пра побыт, даведацца пра абрады і забабоны ды запісаць народныя песні. У душы прысягнуўшы служыць свайму народу, браты Тышкевічы ніколі на адступалі ад сваіх перакананняў, шчыра працавалі на карысць роднага краю.

Праца, праца, праца... Яўстах і Кастусь замалада ўзяліся за пачэсную справу і, бадай, на адным энтузіязме заклалі трывалы падмурак навуковай археалогіі, а таксама этнаграфіі, фалькларыстыкі і краязнаўства. Яны першыя ўвялі ў навуковы ўжытак раней зусім невядомыя матэрыялы, праявіўшы пры гэтым уласцівы ім тэмперамент даследчыкаў, сказалі сваё слова ў розных галінах ведаў, якія цяпер аб'ядноўваюцца ў адзін цыкл грамадскіх навук. Гіпотэзы вучоных, іх меркаванні, высновы, проста здагадкі, а таксама прыведзеныя аргументы і факты — крыніца для нашчадкаў, каму дарага нацыянальная спадчына.

На вялікі жаль, многія апісаныя і даследаваныя Тышкевічамі помнікі зніклі з панарамы нашай зямлі, найперш у выніку пазнейшых акцый вандалізму, а таму іх аўтарытэтныя сведчанні сёння з'яўляюцца, можа, адзінай крыніцай, каб узнавіць праўдзівы вобраз знішчанага аб'екта. З упэўненасцю можна сцвярджаць, што зробленае гэтымі сумленнымі вучонымі — нацыянальны скарб Беларусі, яе навуковай думкі мінулага стагоддзя.

Блізкае знаёмства з навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасцю братоў Тышкевічаў пераконвае нас у тым, што яны сцвярджалі ў грамадстве важную думку пра нацыянальную самабытнасць і гістарычную непаўторнасць Беларусі. Ужо нават па гэтай прычыне іх нельга без агаворак адносіць да дзеячаў польскай навукі, як пераконвалі яшчэ не так даўно некаторыя даследчыкі. Якраз Яўстах і Канстанцін Тышкевічы неўсвядомлена рыхтавалі глебу для засеву нацыянальнага зерня будучай плеядай беларускай інтэлігенцыі.

Браты Тышкевічы паказалі прыклад рэдкай еднасці і суладнасці, не толькі сямейнай, але і духоўнай і, само сабою зразумела, навуковай і творчай. Ні адзін з іх не перакладваў цяжар сваіх клопатаў на другога. Папалам яны дзялілі і перажыванні няўдач. Дожны з гэтых вучоных меў сваё кола сяброў і знаёмых. Працавалі даследчыкі супольна і паасобку, мелі свае калекцыі і нават бібліятэкі. Гэта быў шчаслівы выпадак разумнага суперніцтва дзеля агульнага прагрэсу.

Кожны з братоў Тышкевічаў меў свае асобныя публікацыі, кнігі, кожны з іх трымаўся сваіх канцэпцый, але некаторыя даследчыкі часам штучна аб'ядноўваюць створанае імі ў адно цэлае і тады цяжка разабраць, каму належыць тая ці іншая гіпотэза. Справядлівасць патрабуе, каб, не супрацьпастаўляючы аднаго брата другому, аддаць даніну павагі кожнаму з іх. У гэтай працы чытач пазнаёміцца з малодшым — Яўстахам Тышкевічам.

## Род Тышкевічаў

Радзіма братоў Яўстаха і Канстанціна Тышкевічаў — Лагойск, адзін са старажытнейшых гарадоў Беларусі, які ўпершыню ўпамінаецца ў 1078 годзе. Амаль палова лагойскай гісторыі непарыўна звязана з тышкевічаўскім родам. Іх рэзідэнцыя спрадвеку знаходзілася ля маляўнічай Гайны, на месцы былога замка, у пасаджаным імі ж ландшафтным парку. Тут у 1814–1819 гадах бацька вучоных П. Тышкевіч узвёў у класіцыстычным стылі двухпавярховы палац (разбураны ў Вялікую Айчынную вайну, засталіся руіны). У паўночнай частцы парка знаходзіўся круглы партэр, а бліжэй да палаца квітнеў сад. На поўдзень ад сядзібы выразна бачыліся рэшткі старажытных умацаванняў, якія паказвалі гасцям гаспадары. На беразе ракі стаяла рамантычная альтанка, з якой адкрывалася навакольная панарама. Курціны ў парку былі аформленыя дубам, елкай, ясенем, белай таполяй. Тут жа знаходзілася гарадзішча, на якім калісьці стаяў дзядзінец старажытнага Лагойска. Сёння ўсе гэта выглядае сіратліва, як здзічэлы сад на закінутым хутары.

У сям'і Тышкевічаў прынята было з павагай адносіцца да кожнага помніка на зямлі, што адпавядае і другой іх традыцыі — ушаноўваць кожнага з продкаў свайго вялікага роду. З пакалення ў пакаленне вялася сямейная хроніка. Сам Я. Тышкевіч стварыў у

канцы жыцця альбом «Магілы сямейства Тышкевічаў» і выдаў яго асобнай кнігай у 1873 годзе ў Вільні. Самым першым з дакументальна ўстаноўленых прашчураў быў Цішка, або Тышка, ці, больш дакладней, Цімафей Тышка, які жыў у канцы XV стагоддзя. Другой вядомай асобай пасля Цімафея быў яго праўнук Тодар Тышкевіч, якому выпала хадзіць у падскарбіях Вялікага Княства Літоўскага, потым стаць ваяводам у Наваградку, а яшчэ яго ўключалі ў склад пасольства ў Маскву. Памёр ён у 1616 годзе.

Заснавальнікам жа лагойскай лініі роду з'яўляецца Васіль Тышкевіч (Цішкевіч), што з ласкі вялікага князя Жыгімонта II Старога ў 1516 годзе атрымаў тытул графа і стаў ваяводам смаленскім, пазней — старастам менскім і пінскім. Пад канец жыцця лёс закінуў яго ў Супрасль, дзе ён і памёр у 1571 годзе. Сын Васіля Астафей пасяліўся ў Лагойску і з 1528 года становіцца ўладальнікам гэтага горада і маёнтка. Адсюль і пайшла дынастыя Тышкевічаў. У яго разгалінаваным родзе можна знайсці людзей самага рознага занятку: дзяржаўныя і ваенныя дзеячы, святары, суддзі, літаратары і інш.

У адносінах да рэлігіі Тышкевічы заставаліся даволі талерантнымі. Іх прыналежнасць да той ці іншай канфесіі часта дыктавалася найперш палітычнай сітуацыяй у краіне, а не ўласнымі глыбокімі перакананнямі. Тут трывалай сямейнай традыцыі не існавала. Спачатку яны вызнавалі праваслаўе, а адзін з шаснаццаці сыноў Юрыя Тышкевіча — Аляксандар — у 1609 годзе прыняў каталіцызм. Прыкладна ў гэты ж час Януш Тышкевіч (1570–1643) актыўна падтрымліваў Берасцейскую царкоўную вунію, і ў яго знайшлося нямала паслядоўнікаў. Былі ў гэтым родзе яшчэ і лютэране. Цяжка сёння вызначыць, якой царкве Тышкевічы аддавалі перавагу.

Рэдка якая палітычная, ваенная ці рэлігійная акцыя заставалася па-за ўвагай Тышкевічаў. Адзін з іх — Януш — яшчэ ў XVII стагоддзі вызначыўся ў баталіях з туркамі пад Хоцінам, быў паранены, але поля бою не пакінуў. Удзельнік вайны 1812 года Тадэвуш Тышкевіч меў чын генерала. Тышкевічы ўплывалі на ход вядомай Таргавіцкай канфедэрацыі (1792), як выявілася, выгаднай расейскаму царызму, а таксама засядалі на сейме ў Горадні, удзельнічалі ў іншых палітычных акцыях.

Роду Тышкевічаў у розны час на тэрыторыі Беларусі належалі Валожын, Маладэчна, Доры, Косіна, Астрашыцкі Гарадок… У некаторых уладаннях захоўваліся музейныя калекцыі (Астрашыцкі

Гарадок, Вялае, Красны Двор, Ізабеліна). Шмат адораных людзей даў беларускай зямлі род Тышкевічаў: сярод іх былі эканамісты, архітэктары, мемуарысты, інжынеры, музыкі… Самы ж прыкметны след у духоўным жыцці беларускага народа пакінула лагойская лінія Тышкевічаў, а найперш браты Яўстах і Кастусь.

Рэкордам даўгавечнасці ў гэтым родзе вызначыўся Піус Тышкевіч (1756–1858), бацька вучоных. Атрымаўшы добрае хатняе выхаванне і скончыўшы менскую школу, ён прысвяціў сябе гаспадарчай дзейнасці, умацаванню эканамічнай рэнтабельнасці свайго графства. Поруч з клопатамі эканамічнага парадку П. Тышкевіч шмат рабіў дзеля адраджэння і памнажэння культурнай спадчыны ў родавым Лагойску. Гаспадар графства працягваў пісаць сямейную хроніку, істотна папоўніў хатнюю мастацкую галерэю, а таксама і без таго немалую бібліятэку. Спраўна вёўся архіў графства. Адораны музычна, ён арганізоўваў своеасаблівыя камерныя канцэрты. Бацька вучоных гожа іграў на скрыпцы і нават мог даць сольны канцэрт на папулярнай тады нямецкай файцы.

На гэтым захапленні графа не канчаліся. Будучы аматарам мастацтва, Піус Тышкевіч часта браў у рукі разец і падоўгу карпеў над драўлянай балванкай, пакуль яго спрактыкаваныя рукі не наносілі апошнюю рыску. Гэта мог быць нейкі бажок або мядзведзік ці казачка, словам, цацка дзецям для пацехі. Акрамя таго, граф умеў адмыслова інкруставаць столік, зрабіць прыгожую рамку для карціны з хатняй галерэі.

П. Тышкевіч вёў сямейны дзённік. Дарэчы, гэта стане прыкладам для пераймання яго сынам Кастусю і Яўстаху. Дбаў гаспадар лагойскай рэзідэнцыі, каб хараша глядзеўся не толькі інтэр'ер палаца, але і наваколле. Даводзіў да ладу стары парк, абнаўляў яго, абстаўляў неабходнай атрыбутыкай. У самім жа палацы на сценах красаваліся партрэты некаторых найбольш прыкметных асоб з лагойскай дынастыі. Першая жонка Піуса Тышкевіча — Людвіка з Серакоўскіх — цяжка хварэла і памерла ў маладым веку ў 1803 годзе. Другой жонкай графа стала Аўгуста Плятар (1782–1834), якая паходзіла са знатнага нямецкага роду, што здаўна асеў у Падзвінні, была культурнай свецкай дамай, хавальніцай даўніх традыцый. Прыйшоўшы ў новы дом, яна і тут не страціла добрых манераў цудоўнай маці, жонкі, дарадчыцы. А. Тышкевіч-Плятар нарадзіла трох сыноў: Канстанціна, Фларыяна і Яўстаха, а таксама дачку Паўліну. Ёсць звесткі, што яна прывезла ў Лагойск частку

краслаўскага кнігазбору агульным лікам у тры тысячы тамоў на польскай, старабеларускай, французскай, лацінскай і іншых мовах. Яна не забывалася пра радавод Плятараў, ранні продак якіх недзе ў сярэднія вякі перасяліўся сюды ці не з Баварыі. З часам яго нашчадкі засвоілі традыцыі насельнікаў Падзвіння, а ўжо пазней лічылі сябе тутэйшымі. Нягледзячы на клопаты па выхаванні дзяцей, Аўгуста падзяляла мужава, а пазней і сваіх сыноў Кастуся і Яўстаха захапленне мастацтвам, зборам антыкварыяту, рукапісных кніг, дакументаў гісторыі і г.д.

Словам, хатняя атмасфера для будучых вучоных Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў як нельга лепш адпавядала выхаванню ў іх пачуцця павагі да скарбаў агульначалавечай культуры. Не ўсё ў іх тут было толькі беларускае, мясцовае. Наадварот, у гаспадароў Лагойскага графства, як і ў іншых арыстакратычных сем'ях, за гонар лічылася мець у хатняй галерэі нешта экзатычнае, прывезенае здалёку, каб здзівіць гасцей.

Паводле слоў пісьменніка і краязнаўца П. Шпілеўскага, у Лагойску мелася дзвесце карцін італьянскага жывапісу. У хатняй калекцыі знаходзіўся вялікі збор этрускіх вазаў, рэдкіх знаходак з Пампеі і Геркуланума. Захоўвалася тут багатая калекцыя ў 1140 адзінак манет і медалёў. Як пісаў той жа Шпілеўскі, гонарам сямейнага музея з'яўляліся два мініяцюрныя партрэты легендарнага караля Стэфана Баторыя[1]. Былі тут і старадаўнія рукапісы, гістарычныя карты, на якіх можна было адшукаць Барысаўшчыну і Меншчыну са старажытным Лагойскам. У тышкевічаўскім палацы як сяменная рэліквія ганаровае месца займаў крыж, падараваны ў 1514 годзе вялікім князем літоўскім Жыгімонтам II Старым касцёлу ў мястэчку Гайна. У анфіладах хатняй экспазіцыі дэманстравалі Тышкевічы сваім гасцям падарункі і іншых знакамітых асоб даўняй беларускай дзяржавы, асабліва тых, хто воляй лёсу апынуўся ў Лагойску.

Акрамя гэтага госці маглі пабачыць старадаўнія кальчугі, латы, шчыты, бердышы, коп'і, мячы[2]. Сярод экспанатаў музея ў Лагойску немалое месца займала амуніцыя, якой карысталіся ў часе вайны 1812 года. З пашанай тут прымалі Плятараў, Ржэвускіх, Слізеняў, Дадэркаў, Кастравіцкіх, Ходзькаў, Прушынскіх, Яленскіх…

---

1 Шпилевский П. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю // Современник. 1854. Т. 48. С. 54–56.

2 Минское слово. 1912. № 1525. С. 2.

Маці Кастуся і Яўстаха Тышкевічаў памерла на 48-м годзе жыцця, у 1834 годзе. Зноў заўдавеў іх яшчэ моцны здароўем бацька, але больш не жаніўся. Невысокі, у даўгаватым жупане, заўсёды рухавы, гаваркі, з сівыміваласамі, што так упарта тырчалі на галаве вакол вялікай лысіны, ён чымсьці нагадваў старасвецкага манаха-кніжніка. Стары граф на схіле гадоў усё часцей садзіўся за рабочы стол, каб не ўпусціць чаго і весці працяг сямейнай хронікі. Дапамагаў сваім сынам у археалагічных раскопках, не раз быў саўдзельнікам добрых пачынанняў Кастуся і Яўстаха, асабліва калі старэйшы сын заклаў фабрыку льняных і баваўняных вырабаў. Бацька ж адразу адабраў для экспазіцыі першыя вытканыя паясы, сурвэткі, абрусы, ручнікі. Гэта быў 1837 год. Сваім падзвіжніцтвам, энергіяй і, галоўнае, умельствам патрыярх двара пакараў многіх. І вось выпадак, якога не ведала гісторыя Беларусі, - у стогадовым узросце П. Тышкевіч выбіраецца ганаровым сябрам Віленскай археалагічнай камісіі. Гэта было прызнанне заслуг і падзяка за ўсе старанні на доўгім шляху жыцця.

Ніколі не страціцца і не забудзецца імя яго сына, знакамітага археолага, этнографа, краязнаўца і фальклрыста Яўстаха Тышкевіча, які нарадзіўся ў Лагойску 6 (18) красавіка 1814 года.

Маленства будучага даследчыка беларускіх старажытнасцей прайшло ў цэнтры колішняга ўдзельнага княства. Бадай што кожная эпоха пакідала на гістарычнай памяці Лагойска свае зарубкі, і гэта вельмі захапляла маладетняга Яўсташку і крыху старэйшага яго брата Кастуся. Пра многае яны чулі з вуснаў свайго бацькі, на той час ці не галоўнага захавальніка мясцовай спадчыны. Расказы бацькі былі і першай школай гістарычнага выхавання. Сыны задавалі яму пытанні пра высокія земляныя валы, што па перыметры акаймоўвалі графскі двор.

...Вочы хлопца выхапілі сярод звычайных узвышшаў чароўныя ўзгоркі круглявай формы, калі ехаў з бацькам у Красны Двор.

— Што гэта?

— Курганы.

— Для чаго яны?

— Там людзі пахаваныя.

— Чаму не ў звычайных магілах?..

Пытанні, пытанні, пытанні… Не на ўсе і бацька мог адказаць, але пазней ён сам на іх знойдзе адказы, праяўляючы пры гэтым зайздросную настойлівасць. А пакуль што малы Яўсташка вучыўся ў Лагойску. Сябраваў са сваімі сялянскімі аднагодкамі, і дарога ад бацькавага палаца да хаты тутэйшага мужыка была для яго адкрытай. З гэтымі хлапчукамі ён не раз узнімаўся на Паненскую гару, адкуль добра праглядваюцца далёкія ваколіцы Лагойска. Найвесялейшым святам для хлопцаў было Купалле. Яго абрады нараджалі новыя пытанні. Чароўная Гайна з начнымі рытуальнымі вогнішчамі, з песнямі, скокамі, легендамі і паданнямі навучыла любіць і паважаць любы край, светлых розумам людзей, галасістых пяюх. Спакваля адбывалася духоўнае фармаванне будучых дзеячаў беларускай навукі.

Пасля пачатковай адукацыі Яўстах Тышкевіч у 1824 годзе адправіўся вучыцца ў гімназію ў Вільню, бліжэй да славутага ўніверсітэта. Трапіўшы ў сцены тутэйшых навучальных устаноў і на гулкія вуліцы старасвецкага эўрапейскага горада з вялікімі культурнымі традыцыямі, кожны тут нібы сталеў, набіраўся інтэлектуальнай культуры. Асаблівую патрэбу жыць і вучыцца ў гістарычнай Вільні мела моладзь, у якой былі задаткі да самавыяўлення. Тут сцвердзілі сябе ў навуцы і літаратуры такія дзеці зямлі беларускай, як Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Тамаш Зан, Адам Сузін… На жаль, у 1824 годзе іх ужо ў Вільні не было. Іх адправілі ў глыб Расеі, за тысячы вёрстаў ад дому, але як легенда жыла сярод моладзі памяць пра разагнанае ўладамі таварыства філаматаў і філарэтаў. Яго дух чараваў душы малодшых спадкаемцаў. Успаміналі, як філарэты збіраліся за горадам, спявалі беларускія песні, дэкламавалі вершы. У Вільні над юнаком з Лагойска апекаваўся, напэўна па пратэкцыі бацькоў, прафесар універсітэта Ян Вашкевіч. Рабіў уплыў на яго і прафесар гісторыі Казімір Асмольскі ды іншыя дасведчаныя людзі. Праз нейкі час Я. Тышкевіч спыняе вучобу ў Вільні і па невядомых нам прычынах пераводзіцца ў Менскую гімназію. І хоць сам Менск ніколі раней не быў цэнтрам навукі, але пра мясцовую гімназію гаварылі і пісалі з павагай як пра асяродак перадавой грамадска-дэмакратычнай думкі. Закончыў ён гэтую навучальную ўстанову ў 1831 годзе.

## На казённай службе

Людзі высокага стану, да якога належаў Я. Тышкевіч, звычайна працягвалі вучобу ва ўніверсітэтах. Праўда, прэстыжны для

беларускай моладзі Віленскі ўніверсітэт быў зачынены, а таму многія юнакі кіраваліся ў Іншыя цэнтры навукі. Яўстах паехаў у Пецярбург. Але па невядомай нам прычыне ва ўніверсітэт не пайшоў і, кажучы словамі беларускага паэта Вінцэся Каратынскага, ён сам «уласнымі рукамі назапашваў вялікія скарбы гістарычнай навукі». Правінцыяла ўразіла высокая культура горада на Няве, не толькі яго архітэктура, але і тэатры, бібліятэкі, музеі, асабліва знакамітая кунсткамера.

Малады граф з Беларусі цэлыя дні праводзіў за чытаннем кніг у славутай імператарскай бібліятэцы. Ішло самастойнае «дабіранне» ведаў у гуманітарных навуках: гісторыі, археалогіі, філалогіі, фалькларыстыцы, этнаграфіі, літаратуры, філасофіі, мастацтвазнаўстве, археаграфіі. Ён чытаў працы К. О. Мюлера, М. М. Карамзіна, М. П. Пагодзіна, М.І.Надзеждзіна, М. В. Ламаносава. Жывой рэальнасцю былі для яго імёны, а магчыма, і галасы А.Міцкевіча, А. С. Пушкіна, М. В. Гогаля, П. А. Вяземскага, Я. Баршчэўскага.

9 снежня 1833 года Я. Тышкевіч пачынае службу ў даволі прэстыжнай установе Расейскай імперыі — ордэнскім капітуле, які падпарадкоўваўся толькі цару і сенату. Штат тут быў невялікі, і кожны супрацоўнік займаўся сваёй канкрэтнай справай. Вядома ж, наш зямляк займаў пасаду не першаступеннай важнасці, але ўсё ж працаваў сярод саноўных асоб. Пры яго ўдзеле афармляліся дакументы на ахрыманне царскіх узнагарод (Белага Арла і св. Станіслава), а таксама імператарскіх (св. Андрэя Первазваннага, св. Кацярыны, св. Аляксандра Неўскага, св. Георгія Пабеданосца, св. Уладзіміра і св. Ганны). Не больш двух гадоў правёў Я. Тышкевіч у гэтым аўтарытэтным ведамстве Расеі, затым апынуўся «па-за яго штатам»[3].

Малады Тышкевіч з Пецярбурга едзе ў Вільню на месца новага прызначэння — у канцылярыю генерал-губернатарства. Скупыя архіўныя звесткі не раскрываюць сутнасці ягонага занятку на гэтай службе. Не паспеў ён як след тут абжыцца, як атрымлівае новае службовае прадпісанне і накіроўваецца ў Харкаў, дзе знаходзіцца ў свіце мясцовага генерал-губернатара. Выконвае пэўныя даручэнні і не раз выязджае ў Чарнігаў, Палтаву, Нежын, Канатоп, Любацін, Андрэеўцы. Даспадобы яму прыйшлася багатая бібліятэка Харкаўскага ўніверсітэта. Там Я. Тышкевіч правёў нямала шчаслівых гадзін за чытаннем даўніх фаліянтаў, прадаўжаў самаадукацыю, штудзіраваў літаратуру па старажытнай гісторыі. Паступова ён

3 Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў БССР (далей — ЦДГА БССР), ф. 299, воп. 1, спр. 125, арк. 763–766.

наладжваў сувязі з прафесурай, з мясцовымі навуковымі сіламі, асабліва ў галіне археалогіі.

Летам жа, як звычайна, Я. Тышкевіч адпраўляўся дамоў, каб весці раскопкі кургаоў. А потым зноў вяртаўся ў Харкаў з новымі для сябе загадкамі археалагічных знаходак. Звяртаўся да гісторыкаў-старажытнікаў па кансультацыі, але належнага адказу не атрымліваў. Пісаў адэскім археолагам — іх тлумачэнні таксама не задавальнялі. Як і дагэтуль, яму заставалася задаваць пытанні сабе і самому на іх адказваць, арыентавацца на ўласны вопыт і на сваю інтуіцыю. Ён зноў садзіўся за кнігі. Я. Тышкевіч супастаўляе свае знаходкі з адпаведнымі матэрыяламі, выяўленымі пры раскопках у іншых месцах, і бачыць паміж імі істотную розніцу. Яго хатняя калекцыя знаходак пастуова папаўняецца. Энтузіясту навукі хацелася глыбей заняцца гэтай праблемай, даць адказ на загадкі старонак гісторыі, прасачыць арэал аднатыпных помнікаў.

Бываючы дома, Я. Тышкевіч не прамінае магчымасці пайсці ў чарговую археалагічную разведку, а яшчэ пабываць на вясковых святах, пачуць песні, пабачыць танцы, паназіраць за паводзінамі сельскай моладзі. Не раз і сам ішоў у скокі, і атрымлівалася ў яго гэта вельмі хвацка, нават прыцягвала ўвагу мясцовых хлопцаў і дзяўчат. А на званых вечарах людзей свайго кола Яўстах, як і належыць графу, многіх зачароўваў элегантным выкананнем вальса, мазуркі — і мог тут жа пакарыць сваёй віртуознасцю, выконваючы народны танец, прадэманстраваць суладнасць рытмаў. Што ж, маладому веку маладыя захапленні. Вось толькі з жаніцьбай у яго так нічога і не выйшла. Выпала яму аднаму свой век векаваць.

Да 1840 года Я. Тышкевіч заставаўся ў штаце канцылярыі Харкаўскага генерал-губернатара. Іншых перамяшчэнняў па службе архіў не зафіксаваў. Ёсць толькі глухія звесткі, што ў адпаведнасці са сваімі штатнымі абавязкамі Яўстах не раз выязджаў у розныя гарады паўночна-ўсходняй Украіны. Дзеля адсутнасці архіўнай інфармацыі не ўсё мы ведаем пра гэты этап яго жыцця. Аднак жа вядома, што ён падае ў адстаўку і вяртаецца на Лагойшчыну. Не выключана, што маладога графа «падцiскалі» і клопаты за свой маёнтак Антанопаль[4].

У далейшым Я. Тышкевіч рэдка калі ўскладаў на сябе чыноўніцкія абавязкі. Паездзіўшы па свеце, ён яшчэ больш захапіўся навуковымі даследаваннямі, а таксама прывядзеннем у парадак

4 ЦДГА БССР, ф. 299, воп. 7, спр. 125, арк. 766 адв.

хатніх калекцый, якія датычылі старажытнай гісторыі краю. Штолета Я. Тышкевіч праводзіць археалагічныя экспедыцыі. Разам з бацькам і старэйшым братам ён рупіўся, каб як найрацыянальней падаць у пакоях лагойскага палаца матэрыялы раскопак, а таксама асобных знаходак, дарункаў сяброў. Іх стараннямі стваралася арыгінальная экспазіцыя і спакваля вымалёўваўся вобраз сапраўднага музея, які па вартасці потым ацэньвалі самыя розныя госці, у тым ліку А.Кіркор, П. Шпілеўскі, І.Крашэўскі. Найбольшым святам для сямейства Тышкевічаў стаў 1842 год — год адкрыцця іх хатняга музея.

Я. Тышкевіч-краязнавец у сваіх даследчыцкіх пошуках пакуль што не выходзіў за межы Цэнтральнай Беларусі. Толькі цяпер зрэдку час ад часу ён наязджаў у Пецярбург, Маскву, Кіеў, Варшаву, Кракаў. Навуковыя кантакты пашыраліся, кола знаёмых расло. Вакол яго групуюцца такія краязнаўцы, як І.Жаба, І.Слізень, В. Твардоўскі, К. Тышынскі, М. Чарняўскі і іншыя.

Усё ж казённая служба пра Яўстаха «не забывалася». Праз нейкі час ён прапанаваў сваю кандыдатуру на пасаду ганаровага наглядчыка навучальні Барысаўскага павета і атрымаў згоду з боку апекуна Беларускай вучэбнай акругі[5]. Яму не хацелася лічыцца толькі на словах ганаровым куратарам, і далейшай практыкай ён даказаў сваю адданасць роднаму краю. Першым жэстам гуманнасці новага наглядчыка стала перадача ім у 1848 годзе пабудаванага на ўласныя сродкі памяшкання Барысаўскай павятовай навучальні[6]. Ён жа клапаціўся пра побыт педагогаў і выхаванцаў. Гэтая акцыя Я. Тышкевіча, напэўна, была заўважана і па заслугах ацэнена сучаснікамі. Ён быў абраны маршалкам[7] шляхты Барысаўскага павета. Паводле грамадскай апініі, прызначаецца куратарам Менскай гімназіі, над якой малады граф апекаваўся з 1848 да 1854 года. І тут ён стараўся палепшыць матэрыяльны стан вучняў і настаўнікаў.

Пераезд Я. Тышкевіча ў Менск адкрываў перад ім новыя перспектывы актыўнай навуковай дзейнасці, магчымасць папрацаваць у мясцовых архівах, заняцца іканаграфіяй, мастацтвам, а найперш археалогіяй.

## Далучэнне да навукі

5 ЦДГА БССР, ф. 320, воп. 1, спр. 184, арк. 9.

6 ЦДГА СССР у Ленінградзе, ф. 733, воп. 66, спр. 902, арк. 16.

7 Маршалак (у часы знаходжання Беларусі ў складзе Расейскай імперыі) — прадвадзіцель (кіраўнік) павятовага або губернскага дваранства (шляхты).

Навуковая дзейнасць Я. Тышкевіча пачалася з захапленняў старажытнай гісторыяй. З аднаго боку, у бацькавай калекцыі ён бачыў рэдкія знаходкі, прывезеныя з іншых краін. Там ёсць, а чаму такіх не можа быць у нас пад Лагойскам, Менскам, Заслаўем, Барысавам, Вілейкай? Усё гэта падштурхоўвала брацца за даследаванне мясцовых помнікаў, якіх тады было безліч. Але амаль ніхто не вёў тут раскопак, нават незнарок нельга было разбураць курганы. Гэта лічылася святакрадствам. На такога чалавека слаліся праклёны, і ніхто не адважваўся ўзяць на сябе грэх «разбуральніка». На гэта адважыўся Я. Тышкевіч.

Першыя раскапаныя ў 1837 годзе маладым даследчыкам курганы ў ваколіцах Лагойска сталі пачаткам яго навуковых доследаў. Прыступіўшы да разгадкі таямніцы «капцоў», створаных рукамі чалавека ў старажытныя часы, пад высокімі насыпамі якіх ён хаваў сваіх суродзічаў, Я. Тышкевіч паспяшаўся са сцвярджэннем, што тут, у Барысаўскім павеце, жыў даволі багаты люд, паколькі ім былі выяўлены, на яго думку, рэдкія знаходкі. Але за такія высновы мы не павінны дакараць энтузіяста, бо ён ішоў да пазнання ісціны сваім шляхам, шляхам супастаўлення з аднатыпнымі знаходкамі на іншых тэрыторыях.

Шмат увагі і часу Я. Тышкевіч аддаваў археалогіі, нават тады, калі яго скоўвала і абцяжарвала казённая служба — яму кожны раз належала звяртацца да свайго начальства па дазвол заняцца любімай справай. У пачатку сваёй археалагічнай дзейнасці даследчык канцэнтраваў увагу на помніках толькі ў ваколіцах свайго ўладання. Пра гэта ён пісаў: «Пачаў капаць курганы ў 1837 годзе ў Лагойскім графстве, якія дагэтуль, хоць бы нават выпадкова, не былі разбураныя. Яны лічыліся па народнай традыцыі недатыкальнымі. Мусіў сялянам шчодра плаціць, каб узяліся капаць, і сам разам з імі капаў, каб хоць крыху ўзяць на сябе грэх».[8] Тышкевічавы памочнікі, перш чым узяць у рукі рыдлёўку, станавіліся на калені, маліліся за памерлых і толькі тады распачыналі раскопкі. Нават у працэсе работы, калі ўжо ўпалі векавыя хваіны, узнятая была слой за слоем зямлі і перад вачыма адкрыліся астанкі спаленага чалавека, а сам малады даследчык браў у рукі абрадавыя слязніцы[9], разглядаў пацеркі і іншыя ўпрыгожванні, сяляне зноў станавіліся на калені і «творили молитвы за упокой усопших».

8 Тышкевіч Е. О древних могилах в Минской губернии и Литве // Сын Отечества. СПб, 1838. Т. 6. 51.

9 Слязніца (слязнік) — посуд, які ставілі памерламу ў магілу і ў які быццам бы збіраліся слёзы родных, што плачуць па нябожчыку.

Усе матэрыялы раскопак Я. Тышкевіч нёс і вёз у свой хатні музей, і яны станавіліся часткай немалога ўжо збору іхняй сям'і.

Калі Я. Тышкевічу споўнілася 23 гады, у друку з'явілася яго першае навуковае паведамленне пра раскопкі курганоў[10]. На гэтай апісальнай працы яшчэ ляжыць налёт некампетэнтнасці, нават крыху наіўнасці. Але першаму заўсёды цяжка, і без памылак і сумненняў ніхто не даходзіў да вяршыні навуковай дасканаласці. Тады ж, убачыўшы дарагія ўпрыгажэнні ў кургане, Я. Тышкевіч зрабіў выснову пра загадкавае племя на Лагойшчыне, якое даўно вымерла. Ён лічыў, што гэты «знатны род» ці не з Венецыяй быў звязаны, бо адкуль жа магло ў іх усё гэта брацца? Пазней археолаг будзе мець большы вопыт і амаль дакладна адкажа, якімі шляхамі і што сюды прыбывала, а што выраблялася на месцы.

Зараз з кожнай новай экспедыцыяй ён пранікаў у таямніцы маладой галіны ведаў, якой тады была археалогія не толькі ў Беларусі, але і ў эўрапейскім маштабе. Даследчык паступова стаў рабіць параўнанні з аналагічнымі знаходкамі ў суседніх землях, аналізаваць. Ён пільна сачыў за ўсімі навуковымі працамі, ды і сам не адставаў ад сучаснікаў у папулярызацыі археалогіі. Свае публікацыі падпісаў не толькі ўласным прозвішчам, але і псеўданімамі і крыптанімамі: «Meszkaniec lasów»; «Eust. hr. T.»; «E. T...cz»; «ch. T...». Пісаў ён пераважна па-польску, менш па-расейску, а па-беларуску — у асноўным пра фальклор. На жаль, Тышкевічам, як і многім беларусам, даводзілася пісаць па-польску. Такая была рэальнасць, можна сказаць, горкая іронія лёсу, вынік «адукацыйнай» палітыкі А. Чартарыйскага. Паступова да гэтай палітыкі паланізацыі «прывучылі» амаль усю беларускую інтэлігенцыю. Зрэшты, браты Тышкевічы называлі сябе «ліцьвінамі», маючы на ўвазе гістарычную прыналежнасць насельнікаў Беларусі да Вялікага Княства Літоўскага.

Менавіта дзякуючы пранікненню ў таямніцы старажытнай культуры беларусаў, як матэрыяльнай, так і духоўнай, Я. Тышкевіч пачаў рабіць параўнанні з адпаведнай культурай іх суседзяў. Гаворачы пра некаторыя супадзенні абрадаў, прывёў прыклад пакланення насельнікаў Летувы, латышоў і бліжэйшых славян аднаму і таму ж богу Перуну (Перкуну), а таксама вужакам, волатам-дрэвам. У тых і другіх пры пахаванні чалавека ставілі яму посуд і клалі поруч некаторыя прылады працы і быту. Тут і там яшчэ доўга трымаўся такі пахавальны абрад, як трупаспаленне. Ва ўжытку насельнікаў-суседзяў

10 E. hr. T. Rzeczy krajowe. Wiadomości o kurhanach // Tygodnik Petersburski. 1837. № 94. S. 561–562.

бытаваў і аналагічны інвентар працы. Вучоны бачыў падабенства, але ж ён не мог не заўважыць і пэўнай розніцы. Гэта былі самастойныя этнасы. Вядома ж, да такой высновы прыходзяць даследчыкі не адразу. Для гэтага спатрэбілася раскапаць цэлыя групы курганоў, прайсці пешшу сотні вёрстаў, каб скласці карту помнікаў археалогіі, напрыклад, цэлых рэгіёнаў Беларусі, каб потым мець малюнак засялення краю. Пры знаёмстве з паветам археолаг ставіў перад сабой задачу стварыць малюнак яго мясцовай этнаграфіі, тапанімікі, фальклору, лінгвістыкі, каб зрабіць параўнанні з аналагічнымі матэрыяламі народаў суседніх тэрыторый. Такім вось чынам нараджаўся зусім новы для таго часу параўнальна-тыпалагічны метад. Аб'ектамі для яго апрабацыі сталі, напрыклад, жаночыя пахаванні, дзе можна было назіраць пэўную суму прыкмет, характэрных для акрэсленай і іншых дастаткова вялікіх тэрыторый Беларусі.

У пахавальным інвентары археолаг вычленіў самае адметнае — формы і аздобы скроневых кольцаў. Якраз на такія ўласцівасці Я. Тышкевіч звярнуў увагу пры раскопках старажытных пахаванняў крывічанак. Імкнуўся потым акрэсліць арэал іх распаўсюджання, каб зрабіць вывады пра культуру даўніх насельнікаў.

Захоплены ідэяй вывучэння пахавальнага інвентару, Я. Тышкевіч амаль бесперапынна праводзіць экспедыцыі па Меншчыне, адпраўляецца на Заходнюю Дзвіну, Нёман, знаёміцца з адпаведнымі матэрыяламі на Палессі і Пасожжы. Але найбольшае месца ў яго навуковых даследаваннях займала Барысаўшчына і асабліва Лагойшчына. Яму тут дапамагалі бацька і брат Канстанцін.

Кожная праведзеная экспедыцыя, кожны вывучаны помнік давалі Я. Тышкевічу матэрыял не толькі для навуковай публікацыі, але і для лагойскага музея. Калекцыя разрасталася, ёй, па задуме братоў-археолагаў, належала вылучыцца і стварыць ілюстрацыйны «фон» жыцця і быту далёкіх продкаў. І хоць «афіцыйнае» адкрыццё хатняга музея, як звычайна, не праводзіцца, але па пісьмах Яўстаха і Канстанціна Тышкевічаў можна меркаваць, што іхняя экспазіцыя для наведвання гасцямі Лагойска ўжо была гатова к 1842 году. Займаў музей дзве ці тры залы палаца. Акрамя археалагічных знаходак тут былі калекцыі манет, гербаў, мастацкія палотны і інш. Як і ў многіх музеях, на пярэдні план у экспазіцыі выстаўляліся самыя «прэстыжныя» экспанаты, самыя пампезныя: зброя рыцара, інкунабулы, творы мастацтва, рэчы замежнага паходжання. Былі тут і прадметы, якія дарылі Тышкевічам госці. У розны час у Лагойску пабывалі Адам

Плятар, Іосіф Крашэўскі, Павел Шпілеўскі, Канстанцін Тызенгаўз, Іосіф Жаба, Міхаіл Балінскі, Плацыд Янкоўскі і некаторыя іншыя.

У цэнтры ўвагі наведвальнікаў музея знаходзілася сямейная хроніка графаў Тышкевічаў. Стары Піус быў адным з галоўных «экскурсаводаў». Апрануты ў сурдут з байкі зялёнага колеру, у чырвоную камізэльку з кашміру, ён бойка вёў рэй на званых вечарах.

Акрамя Лагойска, роду Тышкевічаў належаў Астрашыцкі Гарадок. У мясцовым палацы таксама былі каштоўныя калекцыі, праўда, тут большая ўвага аддавалася мастацкай галерэі ды бібліятэцы, дзе захоўвалася нямала рарытэтаў. Да Лагойскага графства належаў Красны Бор, у ваколіцах якога Я. Тышкевіч адкрыў і раскапаў цэлае паселішча. Выяўленыя былі ўнікальныя па мастацкім выкананні прадметы з эмаллю, што самі па сабе склалі цэлую калекцыю. Дарэчы, зараз яны знаходзяцца ў Дзяржаўным археалагічным музеі ў Варшаве. У сталіцу Польшчы яны трапілі 25 кастрычніка 1919 года на пастаянна дзейную выстаўку «Захэнты», а затым іх перадалі ў Дзяржаўны народны музей[11]. Наведванне Краснага Бора для Яўстаха Тышкевіча было прыемным яшчэ і таму, што тут нейкі час жыў вядомы кампазітар і піяніст, педагог Фларыян Міладоўскі (1819–1889), музыкант рэдкага дару, які ствараў санаты, песні, мазуркі, паланезы, накцюрны. У Краснаборскім двары меўся камерны, ці, дакладней, хатні тэатр. На канцэрты не раз прыязджалі самі Тышкевічы і іншыя званыя госці.

Я. Тышкевіч шмат працаваў над разгадкай таямніц помнікаў старажытнасці краю і меў вялікую патрэбу ў кантактах з вучонымі Эўропы. Беларускі археолаг імкнуўся пазнаёміцца з метадамі даследаванняў замежных калег, яму хацелася праверыць сябе — ці тым шляхам ён ідзе. І ён наважыўся адправіцца ў паездку па краінах Паўночнай Эўропы. Я. Тышкевіч проста мроіў аб сустрэчы са спецыялістамі, чый навуковы вопыт быў значна большы ў параўнанні з ягоным. Да таго ж думкі беларускага мецэната займала ідэя стварэння паўнацэннага публічнага музея. І ён паехаў туды, дзе нараджаліся новыя навуковыя тэорыі, дзе ўжо працавалі музеі. Тышкевіч едзе ў краіны Скандынавіі. Там, як яму здаецца, старажытная культура бліжэйшая да культуры яго роднай «Русі Літоўскай».

У 1843 годзе Я. Тышкевіч накіроўваецца ў Швецыю праз Рэвель і Пецярбург. Пабываў ён у Хельсінкі, а потым у Стакгольме. Праграма

---

11 Поболь Л. Древности Белоруссии в музеях Польши. Мн., 1979. С. 107; Дробаў Л. У пошуках скарбаў // Літ. і мастацтва. 1970. 11, 18, 25 верас.

знаходжання за мяжой у яго аказалася вельмі насычанай: працаваў у архівах і бібліятэках, шукаў даўнія крыніцы пісьменнасці, якія б давалі асвятленне старажытнай гісторыі роднага краю, знаёміўся ў музеях з прадметамі археалагічных знаходак. У Стакгольме яму трапіліся рукапісы па гісторыі сярэднявечнай Польшчы і Беларусі. Удалося выявіць творы графікі сваіх зем: лякоў, імёны якіх былі невядомыя. Ён склаў своеасаблівы рэестр знаходак. Малады следапыт навукі не раз сустракаўся з кампетэнтнымі спецыялістамі. Усё ж найбольшае ўражанне на яго зрабілі музеі, дзе цікавіўся ён сістэматызацыяй падачы матэрыялаў у экспазіцыі.

Асабліва пашанцавала Я. Тышкевічу на сустрэчы ў сталіцы Даніі. Спачатку беларускі краязнавец пабываў у музеі мастака А. Торвальдсена, пазнаёміўся з яго творамі. Ён вёў зацікаўленыя гутаркі з дацкімі археолагамі, у прыватнасці з П. Бецкам, які праводзіў даследаванні ў рэчышчы знакамітай «тэорыі трох эпох» Х. Томсена. Больш таго, Я. Тышкевіч пазнаёміўся з прынцыпамі пабудовы экспазіцыі нацыянальнага музея старажытнасцей, зрабіў замалёўкі розных геральдычных знакаў, склаў спісы дакументальных знаходак, а ў музейнай бібліятэцы занатаваў важныя звесткі з рэдкіх кніг розных часоў. Я. Тышкевіч выявіў невядомыя дагэтуль падрабязнасці пра ваенны паход караля Карла XII па Беларусі, дзе фігуравалі знаёмыя геаграфічныя назвы: Горадня, Пінск, Клецак, Нясвіж, Слуцак, Наваградак, Менск, Смілавічы, Крэва, Смаргонь, Суботнікі, Трабы, Гальшаны, Маладэчна, Радашковічы, Ігумен, Бялынічы, Галоўчын, Магілеў, Лясная. Гэта быў выдатны матэрыял для даследчыка гісторыі вайны. Вынікам той паездкі за мяжу стала своеасаблівая «справаздачная» кніга «Лісты пра Швецыю»[12].

## Клопаты аб спадчыне

Паездка па эўрапейскіх краінах вельмі шмат дала Я. Тышкевічу. Ён яшчэ больш захапіўся ідэяй адкрыцця агульнадаступнага музея ў Беларусі — своеасаблівага цэнтра археалагічнай і гістарычнай навукі. Перш за ўсё ён вырашае: у якім горадзе быць такому музею — Вільні ці Менску? Правінцыйны Лагойск ды і іншыя гарады Беларусі тут не канкурэнты.

Пакуль што браты Тышкевічы рупяцца перад саноўным начальствам Пецярбурга за музей у Менску ці Вільні і чакаюць ад яго

12 Listy o Szwecji. Pisał Eust. Hr. Tyszkiewicz. Wilno. 1846. T. 1; 1847. T. 2.

вырашальнага слова. А каб зрабіць уражанне на Пецярбург і паказаць, што музей ствараецца не на пустым месцы, Яўстах спяшаецца арганізаваць краязнаўчую выстаўку, якую меркаваў адчыніць у доме віленскага сваяка Рафала Тышкевіча. Сюды працей запрасіць мясцовую інтэлігенцыю, ды і мецэнатаў тут лягчэй схіліць да дабрачыннай дзейнасці.

Першы крок удаўся. Я. Тышкевіч арандуе «палацык» і ў 1845 годзе перавозіць сюды частку сваёй калекцыі, якая стала пачаткам прыватнага музея. Дакладней, гэта яшчэ і не музей, а невялікая выстаўка, якая стала ў руках энтузіяста сродкам папулярызацыі высакароднай справы. Сапраўды, да гэтага «агменю» культуры і асветы пацягнуліся знаёмыя, сябры, абменьваліся думкамі пра стварэнне навуковага таварыства, выказваліся за адраджэнне ў Вільні ўніверсітэта, зачыненага ў сувязі з вядомымі падзеямі 1830–1831 гадоў. Сябры-аднадумцы не толькі на словах падтрымлівалі калегу, але і ўносілі свой уклад у папаўненне яго антыкварнай калекцыі. Траплялі сюды і экспанаты са скасаваных кляштараў[13]. З усіх гэтых паступленняў паступова фармаваўся музейны фонд. Сам жа Я. Тышкевіч не чакаў гатовых ахвяраванняў і з надыходам вясны выязджаў на археалагічныя раскопкі ў розныя месцы, пераважна Цэнтральнай Беларусі, каб будучы музей стаў сапраўдным асяродкам навукі і культуры.

Трэба прызнаць, што ў Вільні яшчэ музея не было. І тышкевічаўская выстаўка не магла яго замяніць. Ды і адкуль у вучонага магла быць упэўненасць, што ўрадавыя колы дазволяць адкрыць музей якраз у гэтым горадзе. Улічваючы такую няпэўнасць і нават раздвоенасць, знаходкі са сваіх экспедыцый археолаг адпраўляў у дом бацькі — у Лагойск.

Вядома, што ў 1848 годзе маладога графа выбралі кuratарам Менскай гімназіі, той самай гімназіі, дзе некалі вучыўся і ён сам, дзе вучыліся браты Бенядзікт і Ўладыслаў Дыбоўскія, вядомыя вучоныя, а таксама кампазітар Станіслаў Манюшка, астраном Міхаіл Грушневіч, антраполаг Феафіл Худзінскі, гісторык Тадэвуш Корзун і іншыя[14].

Ды і цяпер у Менску жылі і працавалі цікавыя інтэлігентныя людзі — Ваньковічы, Кабылінскія, Кастравіцкія, аматары-калекцыянеры Люцыян Неслухоўскі і Міхаіл Гаўсман, а таксама тэатрал

13 Historia nauki Polskiej. 1795–1862. Wrocław etc., 1977. T. 3. S. 203.

14 Ужо ў наш час на будынку былой гімназіі з'явілася мемарыяльная дошка з пералікам імён знакамітых выпускнікоў, у тым ліку і Я. Тышкевіча.

В. Дунін-Марцінкевіч. Словам, тут квітнела і набірала сілу новае і перспектыўнае на далейшы рост культурнае асяроддзе.

У 1845 годзе, калі Я. Тышкевіч дэманстраваў свае калекцыі ў «палацыку» сваяка Р. Тышкевіча, менскі губернатар А. В. Сямёнаў уключыў дасведчанага лагайчаніна ў склад часовай археаграфічнай камісіі па зборы і публікацыі даўніх актаў і прывілеяў, якія захоўваліся ў розных архівах і кляштарах Цэнтральнай Беларусі і мелі пэўнае навукова-гістарычнае значэнне. У гэтую рабочую групу ўвайшлі людзі, якія не мелі ніякага вопыту ў археаграфіі, далёкія ад навукі, а таму самым спрактыкаваным чалавекам сярод іх аказаўся Я. Тышкевіч.

На першым жа пасяджэнні камісіі, у якой бралі ўдзел Геласій — рэктар Менскай духоўнай семінарыі, Жукоўскі — былы рэктар Архангельскай гімназіі, а таксама чыноўнікі Маладзееў, Гласко, Масальскі, Я. Тышкевіч правёў сярод іх своеасаблівы археаграфічны «лікбез». Пры такой сітуацыі Я. Тышкевіч стаў «як бы галоўным рэдактарам выдання»[15].

Аднак было б несправядліва выключаць з гэтага «гурту» імя менскага губернатара А. В. Сямёнава, які разумеў каштоўнасць выдання, сам любіў корпацца ў архіве, дзе не раз трапляліся яму цікавыя знаходкі. Пры яго садзейнічанні ажыццяўляўся аналагічны выпуск грамат і актаў у Вільні, калі ён там займаў пасаду губернатара.

Што гэта быў за чалавек, які ішоў на супрацоўніцтва з маладым вучоным Тышкевічам?

Аляксей Васільевіч Сямёнаў вучыўся ў Маскоўскім універсітэце. Калі пачалася вайна 1812 года, стаў апалчэнцам. Так ён звязаў свой лёс з ваеннай службай, але не цураўся і грамадскіх праблем. У маладыя гады востра рэагаваў на сацыяльныя праблемы Расеі і нават хінуўся да дзекабрыстаў. Ішоў час, і Сямёнаў апынуўся ў Беларусі. Відавочна, яго перавялі сюды ў сувязі з царскай акцыяй, скіраванай на расправу з паўстанцамі 1830–1831 гадоў. Тут ён паступова набіраў «апінію» ў вярхоўных улад — у кастрычніку 1840 года стаў цывільным віленскім губернатарам. Горад зрабіў на яго вялікае ўражанне сваёй старажытнай культурай. Губернатару захацелася спазнаць таямніцы гісторыі краю. Ён чытаў рэдкія кнігі, архіўныя манускрыпты і прыйшоў да высновы пра неабходнасць выдання зборнікаў

15 Улащик Н. Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода. М., 1973. С. 51.

дакументаў. Пад яго эгідай выйшаў у свет двухтомны «Збор старажытных грамат і актаў гарадоў Вільні, Коўна, Трок» (1843). Далучыліся да гэтай справы ўраджэнец Радашковіч выдавец Антон Марціноўскі і памочнік трыбунальнага архіварыуса В. Нарбут. Гэта А. В. Сямёнаў знайшоў у бібліятэцы Віленскай каталіцкай духоўнай акадэміі верш Яна Пашкевіча «Полска квитнет лациною» (1621 год)[16], які зараз шырока вядомы нашаму літаратуразнаўству. Шмат добрых спраў А. В. Сямёнаў зрабіў і ў Менску пад час свайго новага губернатарства (1844–1850). Ён арганізаваў выданне «Збору старажытных грамат і актаў гарадоў Менскай губерні» (1848), паспрыяў адкрыццю ў Менску публічнай бібліятэкі, рэформе гарадскога тэатра. Зразумела, што ўсяго гэтага не мог не заўважыць Я. Тышкевіч. Ён вучыўся ў свайго мэтра арганізацыі справы, што яму асабліва прыдалося пры стварэнні Віленскага музея старажытнасцей.

Цікава, што мірскі археаграфічны зборнік па назве і па фармаце быў аналагічным віленскаму. Вось толькі тышкевічаўскі фаліянт саступаў папярэдняму каштоўнасцю саміх дакументаў, змешчаных у ім. Гэта і не дзіва, бо Менск да самай рэвалюцыі ніколі не выконваў вядучай ролі ў культурным жыцці Беларусі, а значыць, тут захоўваліся дакументы тэрытарыяльна не далей Менскай губерні. Нікім не засведчана, каб тут хто-небудзь мэтанакіравана вёў збор рукапісаў. У гэтай справе прыярытэт належаў Вільні.

Шырокая натура Яўстаха Тышкевіча імкнулася да многага: ён вёў археалагічныя раскопкі, запісваў фальклор, збіраў экспанаты для будучага музея, у тым ліку гістарычныя дакументы, старажытныя рукапісы, даследаваў этнаграфію, спрыяў ажыўленню культуры і асветы краю. Спагадлівы да чужога гора, Я. Тышкевіч заступаецца за выпускніка Харкаўскага ўніверсітэта Эмілія Паўлікоўскага, потым за невядомага нам Фелікса Магнушэўскага[17], магчыма, пляменніка знакамітага аднафамільца — ксяндза, настаўніка Паўлюка Багрыма. Да сярэдзіны XIX стагоддзя Я. Тышкевіч сфармаваўся ў даволі вядомага дзеяча навукі і культуры. Асаблівае значэнне ён надаваў праблеме адкрыцця музея. Шмат дапамагаў яму яго старэйшы брат Канстанцін.

Як часта тады бывала ў беларускіх сем'ях, называючы сябе «ліцьвінамі», браты Тышкевічы разумелі пад гэтым сваю прыналежнасць да цэнтральнай і заходняй часткі Беларусі, якая фігуравала ў іх

16 Кісялёў Г. Героі і музы. Мн., 1982. С. 23–29.
17 ЦДГА БССР, ф. 299, воп. 7, спр. 125, арк. 778–779.

як «Літва» або «Руская Літва», і толькі Магілеўшчыну і ўсходнюю Віцебшчыну ды большую частку Смаленшчыны яны называлі Беларуссю, а жыхароў — беларусамі. Зразумела, яны, як і іх сучаснік У. Сыракомля, таксама «ліцьвін», не ведалі той мовы, якую мы ў канцы XX стагоддзя чуем у сучаснай Летуве. Ніколі нашы папярэднікі не чулі і назву Вільнюс, бо гэта для іх гучала б вельмі ненатуральна. Для той пары натуральнымі былі Вільня або Вільна. Братам Тышкевічам гэты горад бачыўся цэнтрам блізкага і роднага ім старажытнага крывіцкага племя, фактычна Беларусі. Напэўна, так гэта разумелі і ў Пецярбургу. Бо пасля звароту ў 1852 годзе братоў Тышкевічаў у паўночную сталіцу, як і меркавалася, імператарская адміністрацыя вызначыла нарэшце месца адкрыцця музея старажытнасцей — Вільню.

Між тым, не чакаючы афіцыйнага дазволу, Я. Тышкевіч раз-пораз едзе ў гэты горад, у свой арандаваны двухпавярховы «палацык». Сюды ён прывозіць некаторыя свае калекцыі з Лагойска, асабліва дарагую падборку прадметаў антыкварыяту і іншыя каштоўнасці з розных месцаў Беларусі, імкнучыся тым самым звярнуць увагу віленчукоў на падрыхтоўчы працэс па стварэнні музея. Знаходзячыся сярод дарагіх яму рэліквій, вучоны-энтузіяст часам забываў папалуднаваць ці павячэраць.

Яго сучасніца пісьменніца і мастачка Габрыэля Пузына (1815–1869) пісала, што Я. Тышкевіч «вёз з сабой усе памяткі даўніны як сваіх дарагіх крэўных, як Энэй сваіх багоў»[18]. Паводле яе слоў, археолаг ехаў у Вільню без упэўненасці, што ўлады калі-небудзь дадуць месца для яго скарбаў пад дахам універсітэцкага будынка, на які ён разлічваў. Завіхаўся чалавек, сам раскладваў свае археалагічныя знаходкі, па некалькі разоў іх перастаўляючы з месца на месца, каб кожны экспанат заняў адпаведную «ячэйку» паводле знакамітай «тэорыі трох эпох». Асцярожна браў у рукі посуд, старажытныя бярдышы, разглядаў медалі, пячаткі, сыгнеты, чытаў дакументы на пергаментах... Усё апісваў, рэгістраваў, нумараваў... Па словах той жа Г. Пузыны, у чорным фраку на фоне сваіх рэліквій ён нагадваў «індыйскага бажка», якога Гётэ «выбраў бы для свайго Фаўста».

У лісце да названай Г. Пузыны Я. Тышкевіч дзяліўся сваімі светлымі намерамі, каб гэтыя зборы пашыраліся і перараслі ў музей, вось бы толькі ніхто не перашкодзіў і дапамаглі б сябры-віленчукі, а што будзе залежаць ад яго, то ён гатоў на ўсё, каб толькі для ўсіх была

18 Gabriela z Güntherów Puzynina. W Wilnie i w dworach litewskich. Wilna, 1929. S. 264.

агульная карысць.

## Віленскі музей старажытнасцей

Пасля таго як дазвол на адкрыццё Віленскага музея старажытнасцей быў атрыманы, Я. Тышкевіч праводзіць сход актывістаў і прыхільнікаў краязнаўча-музейнай справы. На ім выбіраюцца кіраўнічыя органы, правадзейныя і ганаровыя сябры Віленскай археалагічнай камісіі, якія павінны былі ўзяць на сябе вялікі аб'ём работы ў падрыхтоўцы музея да адкрыцця. Пад музей была аддадзена старадаўняя ўніверсітэцкая зала Аўла, сама архітэктура якой адпавядала яе новаму прызначэнню. Дадатковым памяшканнем для захавання фондаў музея заставаўся і ранейшы дом, арандаваны ў Рафала Тышкевіча.

Браты Тышкевічы ўзяліся за справу: перавозілі з Лагойска свае археалагічныя калекцыі, кніжныя фаліянты, нумізматычныя зборы і інш. Спісваліся з сябрамі, агітавалі іх ахвяроўваць свае зборы музею. Абодва яны рабілі прыкідку будучай экспазіцыі, складалі яе план. Заўважыўшы, што фрэскі мастака Ф. Смуглевіча ў зале не будуць пасаваць па тэматыцы, запрасілі новых мастакоў, якія здымалі ранейшыя роспісы і рабілі новыя. У адпаведнасці з запланаванай экспазіцыяй на месцы майстраваліся подыумы і іншая мэбліроўка. Для яе выканання запрасілі выдатных сталяроў з-пад Менска. Перад уваходам у музей умацоўваліся гербы чатырох губерняў: Віленскай, Менскай, Гарадзенскай і Ковенскай — Вільня з'яўлялася цэнтрам генерал-губернатарства ўсёй гэтай тэрыторыі.

Археалагічная камісія, якая працавала пры музеі, спрыяла падрыхтоўцы адкрыцця першай экспазіцыі. Амаль кожны з вучоных і актывістаў-краязнаўцаў лічыў за гонар дапамагчы сваім калегам у адказны момант нараджэння музея. Усіх іх гуртавала і аб'ядноўвала творчая і самаахвярная натура Я. Тышкевіча. Менавіта ён быў абраны старшынёй Віленскага музея старажытнасцей і Віленскай археалагічнай камісіі. Віцэ-старшынёй адзінагалосна зацвярджаюцца М. Балінскі, а вучоным сакратаром — М. Круповіч[19].

У склад супрацоўнікаў будучага музея старажытнасцей запра-

19 Правадзейнымі сябрамі сталі Т. Нарбут, І.Крашэўскі, І.Ходзька, П. Кукальнік, А.Кіркор, М. Гусеў, А. Здановіч, І.Ярашэвіч, М. Гамаліцкі, дабрачынцамі музея — К. Тышкевіч, М. Тышкевіч, Р. Тышкевіч, Р. Тызенгаўз, М. Чапскі, А. Слізень, К. Вайніловіч, А. Скірмунт, К. Незабытоўскі і інш. Ганаровымі сябрамі абралі К. Снітку, А. Тышынскага, К.Цівінскага і інш., а сябрамі-супрацоўнікамі сталі І.Кулакоўскі, Т.Ліпінскі, А. Завадскі, А. Адамовіч і інш. Спіс гэты пазней папаўняўся. Кожнаму з іх выдаваўся дакумент сябра Археалагічнай камісіі, што дазваляла ім весці навукова-даследчыцкую працу, выязджаць у экспедыцыі, наведваць бібліятэкі і весці пошукі ў архівах.

шаліся кампетэнтныя людзі з веданнем мясцовай гісторыі, археалогіі, фальклору, архітэктуры, этнаграфіі, археаграфіі, літаратуры, мастацтва. На пасяджэннях камісіі Я. Тышкевіч вёў сябе даволі дэмакратычна, даючы слова ўсім, хто пажадае выступіць, цярпліва выслухоўваў усе крытычныя заўвагі. Ва ўсіх справах музея і камісіі ў яго першым дарадчыкам быў старэйшы брат Канстанцін. Апошні дапамагаў яму і грашыма, калі выдаткі на ўтрыманне музея ўзрасталі, асабліва на правядзенне экспедыцый.

Часта браты Тышкевічы бывалі ў Лагойску, дзе яшчэ жыў састарэлы бацька. Па дарозе дамоў праз Меднікі, Ашмяны, Маладэчна, Краснае яны не раз заязджалі ў Дзякшняны, што каля Радашковічаў, дзе іх ветліва сустракала стрыечная сястра Ядзвіга[20], якая была замужам за Валадковічам. Тут стомленыя дарогай браты Тышкевічы заўсёды маглі адпачыць, а калі трэба, то і падладзіць брычку ці вазок. Сястра вельмі спрыяла ім у іхніх пошуках і разам са сваім мужам адорвала гасцей якой-небудзь музейнай знаходкай.

Віленскі музей старажытнасцей амаль штодня папаўняўся новымі матэрыяламі. Яны ішлі з розных куткоў Беларусі. Бярэм у рукі «Уліковы каталог прадметаў...» і пераконваемся ў тым энтузіязме, з якім ахвяравальнікі даравалі сямейныя рэліквіі. Геаграфія прысланых прадметаў вельмі шырокая: Менск, Магілеў, Віцебск, Ворша, Наваградак, Крэва, Ліда, Горадня, Пінск, Паставы, Браслаў...

Паводле інвентара Віленскага музея, тут значацца камень з выбітым крыжам з Менскай губерні, царкоўны паднос з адлюстраваннем крыжа. Адносіцца ён да 1638 года, знойдзены каля Радашковічаў. Сярод рэліквій ёсць і звон, які адшуканы ў вёсцы Навадніца Гарадзенскай губерні, з надпісам: «В лето 6000-е 9 сот 28-е создан бысть сей святой Троицы повелением раба Божего пана Шедибора Валимонтовича, а мастер Устьек», і нават надмагільны камень: «Во истину преставился Остафей Васильевич Тишкевич. 1558» з паметкай, што знойдзены гэты помнік ля старажытнай царквы ў Лагойску[21]. Сярод экспанатаў, што паступілі на адрас музея, былі слязніца ад Янкоўскага з Ігуменскага павета, пацеркі, бранзалеты, завушніцы з курганоў Лепельшчыны ад М. Кусцінскага, зноў пацеркі, толькі ўжо з Бельскага павета, ад нейкага Янушкевіча. Дзве пацеркі з сіняга шкла перадаў паэт У. Сыракомля, ён знайшоў іх

20 ЦДГА ЛітССР, ф. 716, воп. 4, спр. 28, арк. 16–17.
21 Аддзел рукапісаў Цэнтр. б-кі АН ЛітССР, ф. 22–40, арк. 5, 6, 8.

на месцы раскопак старажытнага горада Кернова[22]. Вельмі цікавыя калекцыі пячатак займала ў музеі асобнае месца. Сярод гэтых рэліквій значацца пячаткі Куцеінскага манастыра, Супрасльскай лаўры, Забельскай дамініканскай гімназіі, Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі, Віцебскай гімназіі, вялікая колькасць знакаў нумізматыкі.

Сярод геаграфічных назваў у кнізе ўліку новых паступлення́ў значацца і маленькія Кушляны Ашмянскага павета. У ваколіцах гэтай мясцовасці шукаў для музея рэліквіі віленскі гімназіст Францішак Багушэвіч. Шаснаццацігадоваму юнаку трапіліся старажытныя акамянеласці, славянскі гадальнік, даўні крыжык і інш. Усё гэта ён прынёс ва ўніверсітэцкі будынак Аўла. Іх прыняў Маўрыкій Круповіч і Адам Кіркор. Не выключагіа, што там Францішак сустрэў і Я. Тышкевіча. Відаць, менавіта ад прызнанага паэта Ўладзіслава Сыракомлі будучы беларускі адраджэнец Ф. Багушэвіч атрымаў падзяку і запрашэнне на адкрыццё музея.

Была сярод музейных рэдкасцяў статуэтка з бронзы. Даставіў яе ў музей А.Кіркор і падпісаў пад экспанатам «Мільда» — багіня кахання. Другую статуэтку прывёз Я. Тышкевіч. Яе навуковую ацэнку зрабіў і Т. Нарбут. Яны абое прыйшлі да агульнай думкі, што гэта вандэлотка, г. зн. жрыца. Знаходкі ў музей пастуралі самыя розныя: ад індыйскай статуэткі і кітайскага бажка да крэўскай пячаткі і польскага сыгнета. Сам Я. Тышкевіч ахвяраваў уласную бібліятэку з трох тысяч кніг, а таксама археалагічную калекцыю з дзвюх тысяч адзінак захавання. Вялікую колькасць экспанатаў са свайго лагойскага музея перадаў і брат Канстанцін. Пра першыя крокі музея пісала прэса, і гэта «падагравала» ў людзей цікавасць да новай навукова-культурнай установы. Ужо ў першыя два гады ў каталогу зарэгістравана было дзесяць тысяч музейных прадметаў. Гэта поспех! Нават наш сучаснік-калекцыянер, які ведае цану кожнаму здабытаму экспанату, не можа недаацэньваць стараннай працы далёкага папярэдніка. Перад Яўстахам Тышкевічам паўстала праблема, дзе ўсё гэта падзець. І хоць усе пакойчыкі былі запоўненыя, ніводнага прадмета не адаслалі назад. Уладальнік кожнага з іх атрымліваў падзяку і запрашэнне наведаць музей пасля яго адкрыцця. Праўда, разам з матэрыяламі беларускага паходжання траплаліся і «імпартныя», што, зразумела, нейкім чынам «размывала» самабытнасць, патрабавала ад супрацоўнікаў пільнай увагі, каб не зблытаць мясцовае з завезеным.

22Там жа, арк. 12.

Штолета выпраўляліся экспедыцыі, каб папоўніць музей гістарычна важнымі матэрыяламі. Сярод сябраў Віленскай археалагічнай камісіі амаль нікога не было летувіскай нацыянальнасці, таму і даследаванні вяліся ў асноўным на тэрыторыі Беларусі. Нават у Ковенскай губерні абследавалася яе паўночна-ўсходняя частка, дзе жыло пераважна беларускае насельніцтва. З такіх рэгіёнаў, як Жамойцiя і Дзукія, матэрыялаў паступала вельмі і вельмі мала. Ішлі знаходкі з Віленскага павета, дзе летувісаў пражывала тады толькі каля двух адсоткаў, з Троцкага павета, дзе іх было некалькі больш. Прыкладна такой была тады і «расстаноўка» навуковых сіл у Вільні. Сам Я. Тышкевіч ды ўсе яго калегі лічылі гэта натуральным і пытанне аб «дыскрымінацыі» не ўзнікала.

У канцы года на пасяджэнні Віленскай археалагічнай камісіі кожная экспедыцыя рабіла сваю справаздачу, аформіўшы яе ў выглядзе рэфератыўнага даклада. Рэчавы матэрыял паступаў у музей, а самі рэфераты змяшчаліся ў «Записках Виленской Археологической комиссии», якія выходзілі штогод. У абмеркаванні вынікаў праведзеных экспедыцый удзельнічалі многія сябры камісіі, але найбольш чынны ўдзел браў Я. Тышкевіч. Ён жа даваў устаноўкі і на наступны год. Тут вучоны зыходзіў з уласнага вопыту, а таксама з дзейнасці падобных арганізацый іншых краін.

Самым урачыстым для музея і Археалагічнай камісіі стаў дзень 1856 года, калі сабраўся народ на адкрыццё першай экспазіцыі. Прыехалі сюды і тыя, хто слаў свае экспанаты, ганаровыя госці з Вільні і іншых гарадоў Беларусі. Усім уручаўся спецыяльна напісаны верш-лісток У. Сыракомлі на памяць пра адкрыццё музея. Людзей сабралася нямала. Да ўсіх прысутных звярнуўся арганізатар і стваральнік Віленскага музея старажытнасцей, яго кіраўнік Яўстах Тышкевіч, які адзначыў важнасць гэтай падзеі для адраджэння гісторыі і культуры края. У гэты дзень ён быў у самым найлепшым настроі — ажыццявілася яго даўняя мара. Ён прымаў віншаванні гасцей, новыя ахвяраванні для музея і не ведаў, што радасць гэтая будзе нядоўгай.

Пасля свята — зноў упартая праца. Ішла яна без асаблівых бедаў, але цяжкасцяў хапала. Па-ранейшаму ўсе арганізацыйныя клопаты браў на сябе Я. Тышкевіч, які хадзіў да розных сталаначальнікаў Вільні, да выдаўцоў, у цэнзурны камітэт. Яго аўтарытэт вучонага дапамагаў музею, і ўсе астатнія супрацоўнікі маглі поўнасцю аддацца навуковай справе. Рэгулярна праходзілі паседжанні Археалагічнай

камісіі, на якіх чыталі рэфераты, ацэньвалі новыя паступленні ў музей, планаваліся чарговыя экспедыцыі. А.Кіркор рыхтаваў каталогі музея. Збіраліся матэрыялы для наступных выданняў «Запнсок Внленской Археологнческой комнсснн».

Навуковая дзейнасць музея набыла дастаткова шырокі розгалас. Пра яе чулі ў Маскве, Кіеве, Кракаве, Адэсе... У 1862 годзе ў Вільню прыязджаў ужо тады прызнаны гісторык М.І.Кастамараў (1817–1885). Ён сустракаўся з Я. Тышкевічам, А.Кіркорам, У. Сыракомлем, А. Адынцом, М. Маліноўскім. З гутарак з імі госць вынес цяжкае ўражанне ад іх нялёгкага жыцця: «Гэта кола літаратараў было ў няласцы ў тагачасных польскіх патрыётаў, якія глядзелі на іх, як на здраднікаў агульнай справе»[23]. Пра Я. Тышкевіча зазначыў: «Гэта быў старамодны чалавек з лысай галавою і меў на выгляд гадоў 60...»

Навуковая грамадскасць прызнала заслугі Я. Тышкевіча, абраўшы яго ў 1859 годзе ганаровым сябрам Пецярбургскай Акадэміі навук. Вучоны дзякаваў за аказаны яму высокі гонар Д. М. Блудава: «Міласцівы гасудар, граф і Дзмітрый Мікалаевіч. Маю шчасце ад 5 студзеня за № 5 атрымаць дыплом на званне Ганаровага сябра імператарскай Акадэміі навук, спяшаюся прынесці вашаму сіяцельству і ўсяму вучонаму саслоўю Акадэміі шчырую падзяку за надзвычай высокі зроблены гонар і прыемную ўвагу да пасільнай маёй працы і імкненняў на карысць грамадскую. Маю гонар пакорнейша прасіць ваша сіяцельства прыняць завярэнне ў маёй высокай павазе і паўнейшай адданасці. Гр. Я. Тышкевіч»[24].

...Настаў 1863 год. Выбухнула паўстанне, якое пачалося ў Польшчы, але, як і ў 1830 годзе, польская шляхта нядоўга супраціўлялася расейскай арміі і ўвесь цяжар руху перамясціўся на ўсход, у Беларусь, дзе актыўнасць атрадаў інсургентаў адзначалася яшчэ і ў 1864 годзе. У гэтым была выключная заслуга Кастуся Каліноўскага. Думы правадыра беларускага паўстання былі блізкія і многім супрацоўнікам музея, сябрам Археалагічнай камісіі.

Віленская казённая адміністрацыя разглядала музей старажытнасцей як адзін з цэнтраў «польскай інтрыгі» і па загаду генерал-губернатара М. М. Мураўёва ў 1864 годзе ён фактычна быў зачынены. Спыніла сваю дзейнасць і Віленская археалагічная камісія. Замест яе працавала іншая — «Комиссия для разбора и приведения в

23 Костомаров Н. И. Несколько слов о славяно-русской мифологии и язычницком периоде, преимущественно в связи с народной поэзией. СПб, 1871. С. 137.

24 Архіў АН СССР, ф. 1, воп. 2 (1859 г.), № 2, § 27, арк. 1.

известность и надлежащий порядок предметов, находящихся в Виленском музеуме древностей». У інспіраваную М. М. Мураўёвым камісію былі ўключаны І.П. Карнілаў — папячыцель навучальнай акругі, М. В. Глебаў-Стрэшнеў — сваяк М. М. Мураўёва, П. А. Бяссонаў — дырэктар навучальні, фалькларыст і этнограф, М. Ф. Гарбачэўскі — архіварыус, а таксама А. Р. Пшчолка — настаяцель сабора. На пасяджэннях камісіі не раз прысутнічаў цывільны губернатар С. Ф. Панюцін. Усе яны былі прыхільнікамі пецярбургскай арыентацыі. Дзеля прыліку ў склад гэтай «світы» ўключылі і самога Яўстаха Тышкевіча, аднак з яго думкамі ніхто не збіраўся лічыцца. Кіраваў камісіяй А. Д. Сталыпін, бацька вядомага Пятра Сталыпіна, міністра ўнутраных спраў, старшыні савета міністраў. Цікавасць да работы камісіі праяўлялі і нават прысутнічалі пры разборах матэрыялаў музея грамадзянскі губернатар С. Ф. Панюцін, адзін з самых першых гісторыкаў паўстання 1863–1864 гадоў В. Ф. Ратч, палкоўнік П. В. Баброўскі.

Да ўсяго меў дачыненне ў краі сатрап Мураўёў, даваў ён указанні і па рэарганізацыі музея, каб тут надалей былі «живые свидетельства искони присущей здешнему краю русской жизни». Для пяцідзесяцігадовага Я. Тышкевіча гэта азначала крах яго надзей. На яго вачах экспанаты музея «рэвізавалі» і як «шкодныя» адпраўлялі ў Маскву. Але і гэта яшчэ не ўсё. Бадай, найбольшую крытыку вытрымаў вядомы вучоны з боку польскіх экстрэмістаў, якія абвінавачвалі яго як кіраўніка музея і Археалагічнай камісіі ў самых розных грахах. Словам, ён атрымліваў удары як справа, так і злева.

Я. Тышкевіч вельмі перажываў за ўнікальныя музейныя калекцыі, з якімі ўлады паступалі бесцырымонна. Супрацьстаяць гэтай афіцыёзнай кампаніі місіянераў было проста бессэнсоўна, і ён прымае рашэнне зняць з сябе паўнамоцтвы куратара-кіраўніка музея. З вялікім болем у душы археолаг у 1865 годзе пакідае Вільню і пасяляецца ў невялікім мястэчку Біржы, якое належала яго сваяку Язэпу Тышкевічу, таксама археолагу. Сум па музейнай справе, заняпад грамадскага жыцця пасля задушэння паўстання, закрыццё некаторых перыядычных выданняў, паўсюдная русафобія — усё гэта канчаткова выбіла Я. Тышкевіча з каляіны нармальнага жыцця. Не вельмі ўзрадавала яго і вестка аб пераглядзе рашэння мураўёўскай камісіі і вяртанні з Масквы ў Вільню вывезеных экспанатаў. Назад трапілі далёка не ўсе прадметы, толькі 206 адзінак захавання. Не вярнулася, напрыклад, унікальная аршанская кальчуга са славянскімі

пісьмёнамі. Яна і да сённяшняга дня экспануецца ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве.

Я. Тышкевіч зразумеў, што больш яму не давядзецца вярнуцца да музейнай дзейнасці. Частка яго збораў з Віленскага музея старажытнасцей пазней трапіла ў калекцыю польскага этнографа З. Глогера, а потым у Нацыянальны музей у Варшаве. Толькі невялікая частка з тых калекцый засталася ў Вільні. Нават не дасведчанаму ў гэтых справах чалавеку было зразумела, што тут задумана стварыць фактычна новы музей паводле мураўёўскага ўзору. Неўзабаве так яно і здарылася. Толькі дзякуючы старанням беларускага археолага І.Луцкевіча частка Тышкевічавых збораў увайшла ў фонд Беларускага нацыянальнага музея ў Вільні (1921–1945). У пасляваенны час новымі ўладамі тыя калекцыі былі падзеленыя і трапілі ў розныя музеі Летувы, а старыя супрацоўнікі рэпрэсіраваныя[25].

## Раскрываючы таямнічасць курганоў

Як ужо гаварылася, Я. Тышкевіч з дваццацігадовага ўзросту апынуўся ў палоне захаплення археалогіяй. Начытаўшыся пра загадкі старажытнага свету, ён вырашыў грунтоўна разабрацца ў тыпах помнікаў на нашай зямлі, высветліць, ці ёсць тут якая заканамернасць і сувязь з культурай плямёнаў, што жылі на тэрыторыі Беларусі, і пачаў, як і большасць археолагаў, з даследаванняў курганоў. Я. Тышкевіч вёў іх раскопкі самым прымітыўным спосабам, ён нібы капаў траншэю, а як толькі дасягаў пэўнай глыбіні, асцярожна здымаў слой за слоем, пакуль не выяўляліся астанкі чалавека. Яўстах Тышкевіч хутка пераканаўся ў бесперспектыўнасці свайго метаду і стаў прымяняць новы, а менавіта перакрыжаваны. Не выключана, што такі метад ён мог пераняць у іншых вучоных, а магчыма, гэта было падказана ўласнай практыкай.

Нешта падобнае назіралася і ў публікацыях Я. Тышкевіча. Самыя раннія з іх грашылі прымітыўным апісальніцтвам, былі без высноў, без ацэнак. Аднак з гадамі да вучонага прыходзіў вопыт, разважанні яго сталі глыбейшымі, а самае галоўнае, ён абапіраўся на фактычны матэрыял, стаў больш упэўненым у сваіх заключэннях.

Нагадаем, як у першай публікацыі «Пра магілы ў Менскай

25 Луцкевіч Л. Скарбніца Беларушчыны // Літ. і мастацтва. 1991. 15 сак.

губерні і Літве» ён пісаў пра знаходкі ў курганах і будаваў свае высновы на інтуіцыі. Эмоцый у аўтара хапала, а вось лагічнага, адэкватнага выяўленым прадметам заключэння не было.

Раскапаўшы дзесяткі кurганоў, углядаючыся ў старажытны абрад пахавання, Я. Тышкевіч шукаў самыя нязначныя адрозненні. І ў сваёй ранняй публікацыі прыйшоў да вываду пра аднатыпнасць пахаванняў і што «магілы (курганы. — *Г.К. і А.К.*) гэтыя былі насыпаныя тады, калі ўжо спыніўся абрад спальвання целаў, г. зн. у пачатку ўвядзення хрысціянства». Развіваючы гэтую думку, Я. Тышкевіч піша пра характэрныя прыкметы той пары, а менавіта пра тое, што пасудзіна ў якасці «слязніц» ставілася каля галоў нябожчыкаў, а вуголле клалі пад целы памерлых дзеля іх захавання. Так, малады археолаг даследаваў курганы розных часоў, ужыўшы метад тыпалагізацыі.

Найбольш разнастайныя знаходкі былі ў жаночых курганах. Яны таксама служылі арыенцірам для характарыстыкі старажытнай эпохі.

Я. Тышкевіч пастаянна шукаў, вучыўся, сумняваўся, даказваў. Практычна ён перачытаў усю гістарычную літаратуру, якая датычыла гэтага пытання, напрыклад, «Кнігу вялікаму чарцяжу, або старажытную карту Расейскай дзяржавы» (1838) насуперак розным тагачасным аўтарытэтам лічыў павярхоўнай і шмат у чым памылковай, хоць яна была значна лепшая за аналагічныя ранейшыя выданні. На карце старажытнай Беларусі яму прыемна было прачытаць знаёмыя назвы Полацак, Завалочча, Себеж, Невель, Азярышча ў басейне Дзвіны, але быў абураны, чаму няма на ёй Віцебска. Зусім не знайшоў на той карце старадаўніх гарадоў Цэнтральнай Беларусі. І прыйшоў да высновы, што трэба весці даследаванні, даказваць іх гістарычную важнасць і ствараць новыя кнігі і карты.

Раскапаўшы сотні крывіцкіх курганоў і прааналізаваўшы пахавальны інвентар, Я. Тышкевіч першы паказаў на іх асаблівасць — скроневыя кольцы ў жанчын. Спосаб вызначэння тэрыторыі засялення крывіцкіх плямён па форме скроневага кальца быў проста ўнікальным для свайго часу. Гэтае адкрыццё беларускаму вучонаму ўдалося зрабіць якраз дзякуючы прымяненню параўнальна-тыпалагічнага метаду. Такі метад даследавання, хоць і інтуітыўна, быў ім выкарыстаны ўпершыню. Тышкевічаўская гіпотэза ў далейшым распрацоўвалася і ўзбагачалася новымі данымі ў працах А. А. Спіцына, а яшчэ пазней — А. У. Арцыхоўскага, В. П. Левашовай.

Паводле таго ж параўнальна-тыпалагічнага метаду вучоны прыйшоў да высновы, што сярод металічных рэчаў часцей сустракаюцца прадметы з жалеза, а сплаў бронзы быў вядомы насельнікам Беларусі значна раней.

Археолаг, безумоўна, адносіўся да сваіх знаходак як да крыніцы, якая станавілася важным аргументам у тлумачэнні некаторых гістарычных з'яў. Так, больш багатыя, чым пад Менскам, знаходкі ў курганах ля Заходняй Дзвіны далі Я. Тышкевічу падставу сцвярджаць, што жыхароў Падзвіння звязваў гандаль з аддаленымі багатымі землямі, дзе рамяство стаяла на больш высокім узроўні[26]. Яшчэ да ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага насельніцтва Беларусі, як падкрэсліваў археолаг, не толькі забяспечвала сябе жалезам сваёй вытворчасці, але і вывозіла яго[27]. У курганах пад Слуцкам ён выявіў жаночыя ўпрыгожанні. На жаль, слаба ім апісаны інвентар трыццаці курганоў на рацэ Гайна. Я. Тышкевіч на матэрыялах сваіх раскопак даказваў, што старажытныя жыхары краю, а таксама Жамойці і Інфлянтаў не адставалі ад іншых плямён у вырабе побытавых прадметаў і прылад працы, а значыць, як сцвярджалі і пазнейшыя даследчыкі, тут не было і варварства. Як доказ ён прыводзіў мноства знаходак з металаў[28]. Гэты тэзіс і на сённяшні дзень да канца не высветлены і ставіцца некаторымі даследчыкамі пад сумненне. А.Р.Мітрафанаў, напрыклад, не лічыць «варварства славян» такім ужо страшным злом у той далёкі час, калі ў славянскім свеце, у тым ліку і ў Беларусі, панавала ваенная дэмакратыя.

Вельмі важна, што Я. Тышкевіч стаяў ля вытокаў статыстычнага метаду параўнання, які даў яму магчымасць падлічыць багатыя і бедныя курганныя пахаванні. Ён зрабіў вывад аб сацыяльнай няроўнасці ў старажытным грамадстве. Багатыя курганы належалі «знатнаму роду, бо знойдзеныя намі ўпрыгожанні ў старажытныя часы вельмі дорага каштавалі, асабліва пацеркі...» Тады яшчэ Яўстах не мог ведаць, адкуль паходзілі ўсе гэтыя каштоўнасці, асабліва пацеркі. Ды і цяпер на гэта няма яшчэ канчатковага адказу.

Вывучаючы пахавальны і іншыя абрады славян і іх суседзяў — летувісаў, латышоў, Я. Тышкевіч прыйшоў да высновы пра іх

---

26Гэты тэзіс Я. Тышкевіча пацвярджаецца навейшымі даследаваннямі. Гл.: Мугуревич Э. С. Восточная Латвия и соседние земли в X–XIII вв. Рига, 1965. С. 20, 26.

27Opisanie zabytków niektórych starożytności odkrytych w zachodnich guberniach cesarstwa rosyjskiego, przez Eust. hr. T... PL. Rok 10. W Lesznie, 1849. T. I. S. 119.

28Там жа.

блізкасць. Усе яны, напрыклад, пакланяліся вялікім камяням, вужакам, магутным старым дрэвам. У тых і другіх пры пахаванні ставілі нябожчыку посуд і клалі прылады працы. Доўга захоўваўся язычніцкі абрад спальвання. Вучоны лічыў, што па лагойскіх курганах можна прасачыць падабенства славян з балтамі, а пакольк яны тэрытарыяльна знаходзіліся блізка, то мелі несупынныя сувязі, хоць і былі розныя па паходжанні. Гэтая думка Я. Тышкевіча была новай для яго часу. Пазнейшыя археалагічныя раскопкі падмацавалі яе, і сёння яе прытрымліваецца нямала вучоных. Так, А.Р.Мітрафанаў лічыць, што ў сярэдняй Беларусі была распаўсюджана балцкая культура, але яна знаходзілася пад вялікім уплывам славян[29].

Практыка раскопак курганоў вельмі шмат дала вучонаму для правільных тэарэтычных вывадаў. Назву «гарадзішча» ён лічыў славянскай, бо на Жамойці такіх назваў не сустракаў. Там ёсць другое слова «pilcalnis», якое абазначае «насыпаная гара». Як адзначае даследчык, на тэрыторыі «губерняў Беларусі Менскай, частцы Гарадзенскай, Віленскай іх было мноства… а назвы вёсак і ўрочышчаў пачынаюцца словамі Гарадок, Гарадзішча, Гародна і г.д.»[30]__ Я. Тышкевіч, як і З. Даленга-Хадакоўскі, лічыў, што гарадзішчы не з'яўляюцца абарончымі ўмацаваннямі, а толькі абрадавымі. Сучасныя археолагі схільныя лічыць іх як, абароннымі (найперш!), так і абрадавымі. Услед за Р. Друцкім-Падбярэскім Я. Тышкевіч тут жа звярнуў увагу на замкі як на ўмацаваныя аб'екты, абведзеныя каналамі іваламі. Такія старажытныя замкі ён упамянуў у Менску, Слуцку, Друцку, Заслаўі, Лагойску і іншых месцах. Коратка расказаў пра кожны з іх. Тлумачыў паходжанне слова «замак» ад «замыкаць». Найбольш познімі, на яго думку, былі замкі ў Лідзе, Крэве, Гальшанах, Міры, якія па сваёй будове блізкія да замкаў Заходняй Эўропы. Вучоны меркаваў, што іх маглі будаваць рамеснікі з Германіі або суседняй Польшчы, але мясцовыя ўмельцы і самі маглі, валодаючы традыцыйным майстэрствам, пераняць эўрапейскае замкавае дойлідства. Не так проста было даць адказ на такое складанае пытанне ў той час. Сёння, дзякуючы сучасным метадам даследавання, гэтым паспяхова займаецца М. Ткачоў[31].

Працуючы шмат са сваімі знаходкамі, археолаг упершыню

---

29Митрофанов А. Новые данные о памятниках VI–XIII вв. Средней и Северной Белоруссии // Древности Белоруссии. Мн., 1966. С. 230–233.

30Badanie archeologiczne nad zabytkami przedmiotów sztuki rzemiosł i t. d. w dawnej Litwie i Rusi Litewskiej przez E. Hr. Tyszkiewicza. Wilno, 1850. S. 16.

31Ткачоў М. Замкі Беларусі (XIII–XVII стст.). Мн., 1977; Ён жа. Замки Белоруссии. Мн., 1987.

зрабіў дэталёвае апісанне каменных прылад працы: сякер, молатаў, кліноў, даў іх характарыстыку. У дадатку да кнігі «Археалагічныя даследаванні» змешчаны малюнкі найкаштоўнейшых прадметаў, знойдзеных у асноўным пры раскопках, што стала вельмі важным аргументам у методыцы даследаванняў, якая ў той час толькі зараджалася. Я. Тышкевіч задумаўся і над прызначэннем археалогіі, якая мае справу са старажытнымі рэчамі і «…тлумачыць мінулае па помніках, якія засталіся ад яго… яна паказвае поступ мастацтва розных эпох, здзіўляе цудоўнай архітэктурай, адчыняе таямніцы хатняга жыцця». Археалогію ён падзяляў на чатыры часткі: уласна археалогію, нумізматыку, гліптыку, палеаграфію. Гэтае чляненне, як прызнаваў сам Я. Тышкевіч, не ім прыдумана, яно ідзе ад агульнаэўрапейскага. Цяжка сёння пагадзіцца з такім падзелам, паколькі ў прадмет археалогіі як навукі ён уключыў, напрыклад, вывучэнне летапісаў. У асноўным жа гэта сфера археаграфіі. Тышкевічава дзяленне археалогіі па такім прынцыпе польскі археолаг А. Абрамовіч лічыць банальным і канвенцыянальным. Аднак Я. Тышкевіч мае рацыю ў тым, канстатуе А. Абрамовіч, што магчымасці археалогіі ў тлумачэнні старажытнай гісторыі вялікія. «…Няма другой навукі, - піша Я. Тышкевіч, — якая была б ёй роўная па шырыні і разнастайнасці. З дапамогай археалогіі, абапіраючыся на довады, у якіх няма сумнення, можна аб'ектыўна пацвердзіць гістарычныя факты». Ён меркаваў, што археалагічныя даследаванні могуць даць адказ на складаныя пытанні пра капішчы, замчышчы, «сыпныя горы», гарадзішчы і г.д. Беларускі вучоны бачыў у пашырэнні археалагічных даследаванняў унікальную перспектыву адкрыццяў, вялікую будучыню навукі, хаця пакуль што яна не мае такой доказнасці, як іншыя дысцыпліны, паколькі многае тут будуецца на здагадках і гіпотэзах. У археалогіі гэта толькі першыя крокі. У «вывучэнні… Русі і Русі Літоўскай», як зазначыў Я. Тышкевіч, яшчэ мала зроблена і мы «павінны самі сабе прабіваць дарогу».

Навуковая дзейнасць патрабавала ад Я. Тышкевіча трымаць у полі зроку даследаванні археолагаў і краязнаўцаў суседніх народаў. Ён адзіны з беларускіх археолагаў першай паловы XIX стагоддзя, хто адправіўся за мяжу да сваіх калег пераймаць вопыт, пабываў у музеях розных краін. Асаблівую цікавасць у яго выклікалі аўтэнтычныя матэрыялы Капенгагенскага музея старажытнасцей, дзе археалагічныя матэрыялы экспанаваліся паводле прызнанай у Эўропе «тэорыі трох эпох» (каменя, бронзы, жалеза). У гэтым была заслуга вядомага дацкага археолага К. Томсена. Гэты арыгінальны метад

экспанавання Я. Тышкевіч перанёс і ў свой лагойскі музей, а пазней — у Віленскі музей старажытнасцей[32].

Вывучаючы скандынаўскую археалогію, Я. Тышкевіч шукаў у ёй падабенства са славянскай. Так, адносна прылад працы ў паўночных плямён ён беспамылкова заўважыў, што спачатку выкарыстоўвалася бронза, а пазней жалеза, так жа сама, як і ў славян. Захапіўшыся аналізам падабенства прадметаў, Я. Тышкевіч вельмі мала сказаў пра іх адрозненні.

На першым этапе знаёмства з новай навукай усіх даследчыкаў захапляе падабенства археалагічных знаходак. Гэтую хваробу «пачаткоўцаў» перажыў і Я. Тышкевіч, і яна трымалася да таго часу, пакуль ён не набыў адпаведны запас ведаў па старажытнасцях не толькі Беларусі, а і ўсёй Эўропы. Нават да сваёй паездкі ў Швецыю беларускі археолаг быў дастаткова падрыхтаваным спецыялістам, а знаёмства з навукай эўрапейскіх калег значна пашырыла яго кругагляд. Можа, гэтая акалічнасць паўплывала на тое, што Я. Тышкевіч смялей браўся за вывучэнне нумізматыкі, геральдыкі, сфрагістыкі, археаграфіі і нават помнікаў архітэктуры, старадаўніх аўтографаў XVI–XVIII стагоддзяў.

Даследчык беларускай археалогіі стаў ініцыятарам выдання «Гадавіка для польскіх археолагаў, нумізматаў і бібліёграфаў», у якім павінны былі ўдзельнічаць многія спецыялісты. Тут ён змясціў сваю працу «Археалогія ў Літве»[33], дзе акрэсліў даволі шырокі абсяг помнікаў Беларусі, якія належыць вывучыць не столькі яму, колькі яго спадкаемцам.

## «Абавязак улюбёнага ў свой край чалавека»

Уражлівая душа Яўстаха Тышкевіча з самага маленства ўбірала ў сябе ўсё тое, што пакінулі на Лагойшчыне мінулыя часы. Яшчэ на пачатку навуковай дзейнасці асноўнай крыніцай, дзе ён чэрпаў веды пра свой край, а галоўнае, само натхненне, былі не толькі бацькава бібліятэка, але і ўнікальныя помнікі старажытнасці, пра якія ён чуў столькі розных легендаў і паданняў. На Лагойшчыне Я. Тышкевіч рабіў «нарыхтоўкі» для будучай кнігі пра гэтую мясцовасць. Тут ужо ён звяртаўся не толькі да археалагічных матэрыялаў. Аўтар паставіў

32Аддзел рукапісаў Віленскага дзярж. ун-та, ф. 236, л. 11–20.

33Tyszkiewicz E. Archeologia na Litwie. Kraków. 1872.

перад сабой задачу сабраць шырокае кола першакрыніц з галіны гісторыі, геаграфіі, тапанімікі, этнаграфіі, літаратуры, мастацтва, археаграфіі, запісваў вусную народную творчасць.

Задуманая праца аказалася такой ёмістай, што прадбачлівы Яўстах, вандруючы па павеце, не толькі збіраў першакрыніцы, а і шукаў аднадумцаў, сааўтараў, тых, хто змог бы дапамагчы яму ў стварэнні задуманай кнігі. І такіх актывістаў-краязнаўцаў адшукалася нямала. Гэта былі людзі розных інтарэсаў і схільнасцей. Я. Тышкевіч даваў заданне сваім памочнікам адшукваць новыя звесткі пра старажытны замак ці даўнейшы абрад, пра гісторыю мястэчка ці мастацкія палотны. Над будучай кнігай працавалі К. Адамовіч, П. Чачот, М. Чарноцкі, Ф. Чаховіч, В. Твардоўскі, Я. Ваньковіч, К. Тышынскі, Ю. Тышкевіч, В. Гарноўскі, а таксама брат Канстанцін Тышкевіч.

Галоўная роля ў падрыхтоўцы кнігі, вядома, адводзілася Яўстаху Тышкевічу, які аб'ядноўваў вопыт і веды сваіх супольнікаў. Ён сабраў увесь чарнавы матэрыял, зрабіў яго сегрэгацыю, апрацаваў, склаў навукова-даведкавы апарат і такім чынам стварыў комплекснае апісанне Барысава і Барысаўскага павета.

Для работы над архіўнымі матэрыяламі Я. Тышкевіч не раз выязджаў у Менск, Вільню, Пецярбург, Маскву. Ён жа думаў і пра тое, да якога выдаўца звярнуцца, каб кніга не проста выйшла ў свет, але і каб яна стала падзеяй у краі. Канстанцін Тышкевіч у пісьме да Плацыда Янкоўскага даволі канкрэтна ўказвае, хто быў асноўным аўтарам «Апісання Барысаўскага павета»: «Брат Яўстах напісаў для статыстычнага камітэта гісторыю горада і цэлага Барысаўскага павета, якая хутка павінна з'явіцца ў друку»[34].

Прайшло дзесяць гадоў нялёгкай працы. За гэты час некаторыя памочнікі Я. Тышкевіча знялі з сябе ўсялякі клопат, адышлі ўбок. І толькі самыя адданыя засталіся ў аўтарскім актыве. Усё ж трэба сказаць, што найбольш спрыялі выхаду ў свет новай кнігі брат Канстанцін, а таксама бацька і маці. Яўстах Тышкевіч удзячны быў Антону Марціноўскаму (1781–1856), вядомаму ў той час рэдактару і публіцысту, Язэпу Азямблоўскаму (1804–1878), літографу і ілюстратару, Льву Пятроўскаму (1792–1856), грамадскаму дзеячу і археолагу, які склаў статыстычнае апісанне павета, а таксама найбольш актыўным аўтарам Канстанціну Буліч, Язэпу Багдановічу, Язэпу Бяліцкаму.

34Аддзел рукапісаў Цэнтр. б-кі АН ЛітССР, ф. 79-645, арк. 3.

Манаграфія «Апісанне Барысаўскага павета» па сваёй форме і сутнасці з'яўляецца краязнаўчай. І тут трэба паставіць у заслугу Я. Тышкевічу тое, што ён арыентаваў аўтараў на максімальнае выкарыстанне мясцовых матэрыялаў. Узнікалі цяжкасці. Напрыклад, пры вызначэнні даты першага ўпамінання Барысава, як і належыць сапраўднаму даследчыку, Яўстах прывёў самыя розныя погляды. Выявілася, што іх нямала, і звязаны яны з імёнамі гісторыкаў Т. Нарбута, І.Данілевіча, В. Тацішчава. Якую ж з датаў браць за аснову? Сам Я. Тышкевіч падтрымаў думку Т. Нарбута пра 1199 год, у той жа час не мог пакінуць без увагі і дату 1102 год, а таксама 1127 (1128) год. Паводле звестак Васіля Мікітавіча Тацішчава, Барысаў пабудаваны полацкім князем Барысам Усяславічам пасля паходу на яцвягаў у 1102 годзе. У Лаўрэнцеўскім летапісе гэты населены пункт прыгадваецца пад 1127 годам, а ў Іпацеўскім — пад 1128 як умацаваны горад Полацкага княства, што быў заняты кіеўскім князем Мсціславам Уладзіміравічам. Сёння гістарычная навука трымаецца трактоўкі В. М. Тацішчава[35].

Я. Тышкевіч паказаў гісторыю развіцця Барысава, звярнуў увагу на важныя старажытныя аб'екты горада, разважаў над тым, дзе ён зараджаўся. Спаслаўшыся на Адама Нарушэвіча, краязнавец апісаў мясцовы замак. Ён быў пабудаваны на выспе на высокім падмурку. Больш за ўсё Я. Тышкевіча цікавіла месцазнаходжанне капішча старажытнага горада. Гэта ж хвалявала і Р. Друцкага-Падбярэскага. Абодва даследчыкі лічылі, што Стара-Барысаў быў аддалены ад сучаснага горада Барысава на чатыры вярсты. Думку Я. Тышкевіча пацвердзіў нядаўна сваімі раскопкамі археолаг Г. Штыхаў, які даказаў, што Барысаў зараджаўся там, дзе зараз сядзіба саўгаса «Стара-Барысаў»[36]. І Я. Тышкевіч, і пазнейшыя даследчыкі гісторыі гэтага горада лічаць, што названы ён па імені князя Барыса. М. Ткачоў прапанаваў даволі слушную гіпотэзу, што назва горада пайшла ад назвы рэчкі Барысы, якая існавала ў раннім сярэднявеччы і пазней знікла, застаўшыся толькі на аксанаметрычных картах. Я. Тышкевіч даволі падрабязна расказаў пра мясцовыя княскія дынастыі, што валодалі Барысавам, апісаў некаторыя найважнейшыя падзеі.

Як і належыць спрактыкаванаму даследчыку, сляды жыцця даўніх плямён на Барысаўшчыне ён бачыў усюды: у тапаніміцы, у

---

35Гісторыя Беларускай ССР. Мн., 1972. Т. І. С. 88.

36Штыхов Г. Города Полоцкой земли. Мн., 1978. С. 100–102.

старадаўніх помніках, фальклоры, этнаграфіі. У сваёй працы ён задумваўся над загадкамі «валатовак» — курганоў, якія так называліся не толькі ў Барысаўскім павеце, а і на Віцебшчыне і паўночнай Магілеўшчыне. Я. Тышкевіч звязвае з імі паходжанне тапонімаў Вяляцічы, Вяляты, Волатава Магіла, Валатоўская Слабада і г.д. Нават у песні, што бытавала ў Вяляціцкім старостве Барысаўскага павета, ёсць выраз «цераз валатоўкі».

У «Апісанні Барысаўскага павета» аўтар даў каштоўныя звесткі і пра Лагойск. Паводле сваіх доследаў і назіранняў ён апісаў мясцовы замак з высокімі землянымі валамі і глыбокаводнымі равамі, які меў абарончае значэнне. Тут жа аўтар даў гісторыю Лагойскага графства.

У гэтай кнізе знаходзім мы інфармацыю пра лагойскі музей, матэрыяламі якога карысталіся не толькі самі Тышкевічы, але і розныя вучоныя, пісьменнікі, мастакі. Я. Тышкевіч даў біяграфічныя даведкі пра заслужаных землякоў — археографа, прафесара Віленскага ўніверсітэта С. Жукоўскага (1782–1834) і І.Шыдлоўскага (1793–1846), літаратара і фальклорыста.

Праца Я. Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета» па заслугах ацэнена Я. Карскім[37], А. М. Пыпіным[38] і іншымі. Н.Гілевіч лічыць этнаграфічную частку работы адным з лепшых навуковых дасягненняў у даследаванні быту і творчасці беларускага сялянства[39].

## «Вазьмі маці, пяску жменю...»

Яшчэ гімназістам Яўстах Тышкевіч прыглядаўся да народных рытуалаў, прыслухоўваўся да голасу сялянскай песні. Зачараваны яе зместам і формай, ён не пераставаў захапляцца хараством беларускага меласу. «Пушчу голас дуброваю...» — здаецца, вось так і паўстае гай зялёны і свежасць ранняя. Пазней даследчык будзе ўспамінаць, як ён не раз бываў на беразе Гайны і Бярэзіны і чуў там працяжныя галасы, калі вёска з вёскай пераклікалася. А ўжо песні жнеек — гэта само адухаўленне працы. Хадзіў нівамі і слухаў юны Тышкевіч песні, багатыя і змястоўныя.

Займацца фальклорам Я. Тышкевіч пачаў адначасова з археалогіяй. Духоўная культура народа ніколі не пакідала яго абыякавым.

37Карский Е. Ф. Белорусы. Вильно, 1904. Т. 1. С. 217.

38Пыпин А. Н. История русской этнографии. Белоруссия и Сибирь. СПб, 1892. Т. 4. С. 57–58.

39Гілевіч Н. З клопатам пра песні народа. Мн., 1970. С. 20.

Нават працуючы ў галіне археалогіі, этнаграфіі, краязнаўства, ён ніколі не забываўся пра песню народную. Зрэшты, і першая публікацыя па фальклоры[40] выйшла ў адзін год з публікацыяй па археалогіі, прычым фальклорная праца сталася глыбейшай па думцы, больш змястоўнай.

У ёй Я. Тышкевіч даў апісанне святочнай урачыстасці на берагах Бярэзіны. На пераломе лета ў ноч на Івана Купалу сялянская моладзь абыходзіць ваколіцы. Кожная вёска на заходзе сонца раскладвае вогнішчы, юнакі і дзяўчаты абступаюць агонь і спяваюць. Спевы адной вёскі пераклікаюцца са спевамі іншых. Старыя хоць і не спяваюць, але шчыра падтрымліваюць урачыстасць. Кветкі — асаблівая прыкмета свята. Збіраюць іх з вечара, затыкаюць усе шчыліны, каб праз іх не магла пралезці ведзьма.

Па народным звычаі, піша Я. Тышкевіч, у гэтую ноч гаспадары не выпускаюць коней на пашу, каб яны не спалохаліся русалак. У купальскую ноч гадаюць, шукаюць папараць-кветку, чакаюць усходу сонца, калі схаваны скарб можа адкрыцца. Не забываюць сяляне і пра злых духаў, якіх трэба выгнаць, ад якіх трэба ўратавацца.

Я. Тышкевіч быў знаёмы з апісаннем Купалля паводле храніста XVI стагоддзя М. Стрыйкоўскага і прафесара Харкаўскага ўніверсітэта Ф.І.Успенскага. У сваёй працы, дзе ён апісаў мясцовы абрад на берагах Бярэзіны, даследчык адзначаў, што Купалле ні да якой рэлігіі не належыць, гэта самастойная з'ява, якая зарадзілася яшчэ ў язычніцкія часы. Сапраўды, тут шмат элементаў дайшло з мінулага тысячагоддзя. Купальская паэзія з'яўляецца мастацкім адлюстраваннем пэўных старажытных уяўленняў народа аб жыцці прыроды. Зрэшты, у саміх тэатралізаваных скоках вакол агню заключалася пэўная сімволіка. С. Богуш-Сестранцэвіч лічыў гэта ўшанаваннем нейкага боства.

Я. Тышкевіч звяртаўся да сваіх калег з просьбай «аб зборы купальскіх песень не ў адной толькі мясцовасці», а ў шырэйшай акрузё, што можа быць карысным для даследавання ўсяго абраду, таму што купальская паэзія своеасаблівая, вельмі спецыфічная і часта не мае аналагаў у земляробчым календары беларуса. Даследчык тут прытрымліваўся пашыранай ужо ў яго час думкі, што Купала — багіня плёну. Усе пазнейшыя вучоныя толькі пацвердзілі, якое значэнне надаваў беларускі селянін гэтаму так хораша распрацаванаму

40E. Hr. T. Zabawy i uroczystości ludu wiejskiego. Kupało. // Tygodnik Petersburski 27.8 (18.9). 1837. N 66. S. 395–396.

тэатралізаванаму святкаванню[41].

Я. Тышкевіч адзін з першых узяўся за запіс легендаў, звязаных з рознымі зёлкамі, пераважна абрадавага ці лекавага прызначэння. Цяжка сказаць, калі ён распачаў сваю работу. У рукапісным сшытку «Зельнік Барысаўскага павета»[42] мы знаходзім розныя назвы зёлак і чым яны цікавыя. Хутчэй за ўсё, гэтая праца так і не была завершана. Часткова яна змешчана ў «Апісанні Барысаўскага павета». «Зельнік...» складзены ў алфавітным парадку, кожнай расліне даецца характарыстыка. Вось як, напрыклад, апісваецца барвенак звычайны: «Агародная расліна, лісце цвёрдае, заўсёды зялёнае, нават зімой пад снегам. Славіцца ў народзе і ў медыцыне вывядзеннем каўтуна. Таму яго ўжываюць не толькі для дэкору, а і для мыцця галавы, для зняцця каўтуна...» Найлепей апісана папараць. Акрамя медыцынскіх лекавых вартасцяў, аўтар падае легенду пра яе сімвалічнасць на Купалле, калі спраўляліся старажытныя абрады «язычнікаў-ліцьвінаў». Хто знойдзе кветку папараць, той самы шчаслівы чалавек, перад ім адкрываюцца ўсе скарбы зямлі, як бы глыбока яны ні былі закапаныя.

Я. Тышкевіч адзін з першых у беларускай фалькларыстыцы і этнаграфіі даў на прыкладзе Барысаўскага павета ўвесь гаспадарчагадавы каляндар селяніна. З дасведчанасцю этнографа Я. Тышкевіч падрабязна апісвае апрацоўку лёну, ўборку і захаванне гародніны: буракоў, капусты, агуркоў, рэпы, бручкі, цыбулі, морквы і інш. Напрыклад, агуркі соляць «у бочках розным спосабам з кропам, дубовым, вішнёвым, лаўровым лісцем. Пасля шчыльнага закрыцця і асмалення бочкі апускаюць у ваду, дзе ўсё добра захоўваецца аж да ўжывання». Аўтар піша пра ўборку бульбы, а таксама пра капцы, скляпы, дзе яе хаваюць, каб не згніла і не памерзла. Уборка бульбы — адна з самых цяжкіх сельскіх работ, бо трэба выкапаць кожны куст «рыдлам».

Сярод многіх задач, якія ставіў перад сабой даследчык, была і такая: прасачыць ход вяселля і паказаць маральна-этычныя карані ў складанні новай сям'і барысаўскіх беларусаў. Ён імкнуўся растлумачыць сувязь язычніцкіх абрадаў, элементы якіх замацаваліся ў хрысціянскіх вераваннях, і прадэманстраваў гэта на прыкладзе ўшанавання дзядоў, абрадаў прыкладзін, святкавання Купалля, Калядаў і іншых святаў. Кожную з адметных з'яў народнага жыцця Я. Тышкевіч

41Ліс А. Купальскія песні. Мн., 1974. С. 194.

42Аддзел рукапісаў Цэнтр. б-кі АН ЛітССР, ф. 9-1033, арк. 1-35.

сілай свайго таленту змог разгледзець у рэчышчы ўсёй культуры краю.

Расказваючы пра абрад вяселля, Я. Тышкевіч пачынае з апісання традыцыйнай першай сустрэчы двух бакоў — маладога і маладой, якая носіць народную назву «запоіны». Пышнасць гэтага застолля, зрэшты як і ўсяго вяселля, залежыць ад заможнасці бацькоў. Галоўная дзейная асоба на запоінах — старшы сват, звычайна чалавек вопытны, вясёлы, гутарлівы, дарадчы, паважаны ў наваколлі. Прыбывае сват з гарэлкай ва ўмоўлены час. Дзяўчына збірае сяброўак. На запоіны запрашаюць таксама хрэсных і крэўных. Калі ўсе ў зборы, дзяўчаты суправаджаюць да стала маладую наступным спевам, які звернуты да свата:

Ото ж табе, Васілька,

Увядзёнка Агатка,

Калі яе любіш, дай пірог,

Калі ня любіш, то вон за парог.

Я. Тышкевіч змясціў дзевяць песень для ілюстрацыі першага акта вясельнай урачыстасці і кожны з іх — ёмістае вершаванае апавяданне з вялікім зместам і нават падтэкстам.

Яўстах Тышкевіч вельмі дакладны ў апісанні змовін. Ён перадае змест абраду з такой глыбокай праўдзівасцю, быццам сам не раз удзельнічаў у гэтай урачыстасці. Напрыклад, адносна вясельнага поезда маладога сказана, што ён «складаецца звычайна з трох свах (старшая свацця — хросная матка, дзве малодшыя — сёстры або бліжэйшыя сваячкі), двух дружкоў, столькі ж намеснікаў і хроснага бацькі, які вязе сваццяў і якога там завуць вазіла...».

Пры сватанні гаворка ішла і пра пасаг і пра гаспадарку маладога, бо тут, як зазначае Тышкевіч, абмяркоўвалася і матэрыяльная трываласць будучай сям'і. Лічыцца, што элемент куплі-продажу ў вясельным абрадзе даволі старажытны, «існаваў у эпоху распаду родавага ладу... вяселле ў патрыярхальнай сям'і з'яўлялася перш за ўсё гаспадарчым пагадненнем, што звязвалася са стварэннем новай эканамічнай адзінкі»[43]. А.М.Нікольскі таксама лічыць, што гэты абрад вельмі старажытны і «адносіцца да родаплемяннной эпохі»[44].

Дэталёва падаецца Я. Тышкевічам і абрад замесу каравая.

43Померанцева Э. В. Семейная обрядовая поэзия // Русское народное поэтическое творчество. М., 1956. С. 244.

44Никольский Н. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности. Мн., 1956. С. 44.

Галоўная каравайніца пры гэтым просіць бласлаўлення: «Ёсць тут Бог, бацька, матка, родныя і суседзі, блізкія і дальнія, мужы статэчныя, бабкі запечныя, дзеткі заплечныя, блаславіце краснай панне каравай учыніць». Трэба зазначыць, што ўсе прымаўкі, песні даюцца ў арыгінальным гучанні.

Вечарам запрашаюць пяць ці сем каравайніц і трох мужчын, каб мясіць і пячы каравай. Старшая каравайніца спявае:

Благаславіце, людзі,

Блізкія суседзі,

Гэтаму дзіцяці

Каравай замясіць…

Чаму такую ўвагу да абраду каравая праяўляў вучоны? У вяселлі ён займае бадай самае пачэснае месца. Зразумела, што народ гэтым яшчэ раз напамікаў пра павагу да адвечнага, да працы аратага і сейбіта. Гэта найдаўнейшая традыцыя беларускага вяселля, якая зарадзілася ў пару язычніцтва. Тады паганскіх багоў задобрывалі тым, што акрамя ўсяго іншага «требы и короваи им ломят… иже нарицается беззаконная трапеза, менимая Роду и Рожаницам…»[45]. Вось адтуль ідзе пакланенне караваю пры стварэнні маладой сям'і. І калі некаторыя элементы беларускага вяселля зніклі або рэканструяваліся, то каравайны абрад стаўся самым моцным і даўгавечным.

Я. Тышкевіч зазначае, што вяселле прайшло праз некалькі гістарычных эпох, кожная з якіх пакідала свой след. Нават неспрактыкаваны чалавек можа адчуць і ўбачыць у ходзе вяселля шмат перажыткаў мінулага. У песнях прысутнічаюць назвы грошай, якія ўжо даўно выйшлі з ужытку: талеры, дукаты, шэлегі:

Верабей, дружка, верабей,

Па суметніку паскакаў,

Нагой шэлег выкапаў,

Сваю дзеўку выкупляў.

Трэба прызнаць, што Тышкевічаў варыянт запісу вяселля найбольш багаты і дакладны. У першай палове XIX стагоддзя яго яшчэ можна супаставіць з апісаннем А. Ф. Рыпінскага. Аднак розніца ўсё ж

45Памятники древнерусской церковно-учительной литературы. СПб, 1897. Вып. 3. С. 225–227.

адчуваецца: Аляксандар Рыпінскі фальклорныя і этнаграфічныя назіранні ўзнаўляў для кнігі «Беларусь» (1840) у парыжскай эміграцыі, па памяці, а ў «Апісанні Барысаўскага павета» ўсе абрады, звычаі, песні ўзятыя з натуры. Не выключана, што Яўстах па некалькі разоў мог звяртацца да сваіх землячак-сялянак і дапаўняць ранейшыя запісы, што ніяк не выпадала рабіць А. Ф. Рыпінскаму.

Абрад вяселля на беларускіх землях, як і іншыя фальклорна-этнаграфічныя абрады, на працягу стагоддзяў уплываў на выпрацоўку нацыянальнай самабытнасці, вылучаў беларусаў сярод суседніх народаў. Праўда, на гэты бок асаблівай увагі не звяртаецца, ды ў сярэдзіне XIX стагоддзя пра гэта было яшчэ рана гаварыць. Для Я. Тышкевіча важней было прадэманстраваць шматколерную карціну саміх абрадаў і рытуалаў.

Па вядомых прычынах Я. Тышкевіч не змог апісаць вяселле на беларускай мове, хоць у іншым выпадку ён гэта зрабіў бы абавязкова. Падставамі для такога меркавання з'яўляюцца яго стаўленні да беларускай культуры, глыбокія яе веды і высокая ацэнка. І яшчэ адзін важкі аргумент на карысць такой гіпотэзы: Я. Тышкевіч кожную народную песню перадаваў без зменаў, захаваў асаблівасці беларускай мовы. Дарэчы, у Тышкевічавым апісанні вяселля застаўкі, дыялогі гучаць па-беларуску з захаваннем асаблівасцяў сінтаксісу.

Абмалёўваючы каларыт народных урачыстасцяў, Я. Тышкевіч заключае, што духоўнае жыццё беларускага селяніна вельмі часта не супадала з матэрыяльным. Беднасць краю, безумоўна, адбіваецца на ўзроўні духоўных запатрабаванняў, але ж «бяда і розуму вучыць», павазе да даўніны, якую «селянін сэрцам чуе». Жыхар вёскі сумленна з пакалення ў пакаленне ўшаноўвае памяць продкаў, іх духоўны скарб, які перадае ўнукам.

Вёска, як прызнае вучоны, дзякуючы пастаяннаму насельніцтву забяспечвала пераемнасць традыцый. Гэты комплекс выпрацаваных стагоддзямі каштоўнасцяў сфармаваў сам уклад жыцця («Так рабілі нашы бацькі і дзяды», — гаварылі ўсе на беларускім прасторы). Асабліва трывалымі гэтыя традыцыі былі ў эпоху феадалізму.

Адным з важных момантаў у вывучэнні народнай культуры з'яўляецца даследаванне абраду ўшанавання продкаў, або Дзядоў. Як сцвярджае Я. Тышкевіч, Дзяды на Барысаўшчыне называліся восеньскімі, стаўроўскімі, змітраўскімі, а таксама веснавымі, або Радаўніцай.

Абрад Дзядоў асенніх больш распаўсюджаны. Пры гэтым Тышкевіч спасылаецца на вядомую паэму А.Міцкевіча «Дзяды». У абрадзе выконваюцца і адпаведныя песні. Іх спяваюць каплан і паэт, так званы казляр, гусляр, таму і ўрачыстасць называецца «ўшанаваннем казла». У гэтых песнях услаўляліся адвага ў баях, а таксама традыцыі сямейнага жыцця, вартыя ўшанавання. Хоць тэкстаў саміх песняў Я. Тышкевіч не падае, але сам факт спеваў гусляра вельмі цікавы і, напэўна, належыць да больш старажытных абрадаў пахавальнай песнятворчасці беларусаў.

Даследчык дае больш падрабязнае апісанне змітраўскіх Дзядоў, якія праходзяць даволі стрымана. Страў на стол падаецца шмат, прычым няпарная колькасць. Запрашаюцца ўсе блізкія памерлых. Па традыцыі лічыцца, што і памерлыя сюды «запрошаны». Пасля ўсяго рытуалу госці гавораць: «Святыя дзяды! елі і пілі, ідзіце да сябе».

Радаўніца, або Дзяды веснавыя, бывае ў аўторак пасля праваднай нядзелі. Я. Тышкевіч падкрэслівае, з якой павагай і цеплынёй людзі адносяцца да самога абрада ўшанавання продкаў, а сам гэты дзень становіцца святочным. На могілках збіраюцца пасля абеду, раскладаюць прынесеныя стравы, пафарбаваныя яйкі. Да памерлых звяртаюцца: «Святыя радзіцелі, хадзіце да нас есці, што Бог даў!» Да памінальных абрадаў Я. Тышкевіч аднёс і абрад прыкладзін, які заключаецца ў тым, што сваякі на магіле нябожчыка ўстанаўліваюць крыж ці камень з крыжам, адбываецца імша.

У апісанні як памінальных, так і калядных абрадаў Я. Тышкевіч быў калі не самы першы, то адзін з першых сярод беларускіх этнографаў і фальклarыстаў. Таму яго погляды, ацэнкі часта з'яўляюцца адпраўнымі для наступных пакаленняў даследчыкаў. «Каляды, — піша аўтар кнігі, - паводле разумення гісторыкаў, мабыць, назва боства даўніх славян». І хоць урачыстасць прыпадала на дзень нараджэння Ісуса Хрыста, усё ж ён лічыць, што вытокі калядавання трэба шукаць у часах язычніцкіх і тлумачыць гэта тым, што на Каляды забіваюць вепра, прыносяць ахвяру Калядзе («забіваюць Каляду»), а гэта напамінае прынашэнне пладоў зямлі на Куццю.

Услед за І.Храпавіцкім Я. Тышкевіч досыць падрабязна апісаў так званыя святыя вечары. Яны з'яўляюцца працягам тых абрадаў, пра якія пісалася вышэй, і па традыцыі праводзяцца ад Калядаў да свята трох каралёў (правадоў). З заходам сонца ніхто не прадзе, не шые, не шчапае нават лучыны… Усе ўстрымліваюцца ад усялякіх

работ. Але для «грэшнікаў» было і выйсце: дастаткова было перасекчы прасла ў плоце, як гэтыя «грахі» адпадалі.

Даследчык не абышоў увагай і такое свята, як Вялікдзень. Даволі сціпла, адзначыўшы толькі асобныя моманты, ён напомніў, што перад Вялікаднем святар свянцае ў адкрытых кубельцах (лубках) «нястачу», якая называецца пасля гэтага свянцонкай і ўжываецца на свята. Абрус, на якім стаяла «нястача», летам бароніць ад граду, калі яго выкінуць на двор. Я. Тышкевіч апісаў практычна гадавы цыкл святаў, увесь земляробчы каляндар, не прамінуў ён Юр'е, Спас.

Асаблівая ўвага звернута ім на жніўны цыкл. Першым момантам з'яўляюцца зажынкі, якія радуюць і абнадзейваюць гаспадара ніўкі. Вока земляроба цешыцца з плёну свайго засеву. Я. Тышкевіч піша пра зажынкі снапка-»гаспадара», якога затым прыносяць у хату. Стаіць ён на куце аж да прачыстай, калі абмалочанае зерне свянцаецца, а частка ідзе на пасеў. Як піша даследчык, сама назва рытуальнага снапка «гаспадар» слушная, бо гэта хлеб, з якім звязваецца дабрабыт, парадак і згода[46]. Рытуал «пакрывання поля» датычыць толькі маладзіц, якія першы раз пасля замужжа выходзяць у поле жаць. Яны пакрываюць сноп кавалкам палатна, каб не было неўраджаяў.

Асобны раздзел Я. Тышкевіч прысвяціў чарам і тлумачыў іх трываласць і распаўсюджанасць у народзе сілай слова чараўніц, напоўненага таямнічасцю. Даследчык крытычна ставіўся да ўсякай забабоннасці, якая нікому карысці не прыносіла. Чары Я. Тышкевіч лічыў з'явай вельмі даўняй, узніклай у дахрысціянскія часы.

Вельмі трапна сказаў даследчык аб прызначэнні прымавак у духоўным жыцці людзей. «Народная паэзія дае нам магчымасць пазнаць пачуцці народа, а прымаўкі — пазнаёміцца з яго розумам». Даследчык першым у гісторыі фалькларыстыкі робіць падзел прымавак на «гістарычныя», «набожныя», «забабонныя», «адносіны падданых з панамі», «навука жыцця і маралі», «хатняе жыццё, сямейнае і грамадскае», «жарты, прымаўкі, сваркі», «прымаўкі пакрыўджаных», «пра гасціннасць», «раскоша жыцця», «здзеклівыя парады», «розныя прымаўкі», «прымаўкі гандляроў», «прымаўкі аратых». Раздзел прыказак і прымавак — адзін з самых прыкметных у Тышкевічавым зборы фальклорных твораў. У яго запісах пададзена іх каля 450 тэкстаў: «Свая хатка, як родная матка»; «Пытайся не ў

---

46Tyszkiewicz E. Opisanie powiatu Borysowskiego... S. 392.

старога, а ў бывалага»; «Хоць за вала, абы дома не была»; «Доля прымацкая сабацкая»; «Жонку бяры далёка, кароўку купляй блізка»; «Чым галее, тым дужэе» і г.д.

Даследчык фальклору на канкрэтных прыкладах толькі аднаго рэгіёна паказаў, як шмат тоіць у сабе кожны край.

І сёння праца Я. Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета» ўспрымаецца як выдатны набытак беларускай даследчыцкай думкі XIX стагоддзя. У ёй даследчык схіляўся да міфалагічнай школы ў беларускай фалькларыстыцы. Вынікам яго творчых пошукаў стаў заключны раздзел кнігі, дзе выкладзены погляды аўтара на славянскую супольнасць, на важную праблему этнагенезу славян. Я. Тышкевіч спецыяльна засяродзіў увагу на цяжкасці вывучэння Барысаўшчыны ў агульнаславянскім кантэксце. Улічваючы працы найдаўнейшых гісторыкаў, вучоны адбірае ў асноўным толькі той матэрыял, які б мог растлумачыць жыццё духоўнай культуры на Барысаўшчыне.

І пасля выхаду «Апісання Барысаўскага павета» Я. Тышкевіч працягваў займацца беларускім фальклорам і этнаграфіяй. Яго падборка прыказак і прымавак з каментарыямі з'явілася ў 1850 годзе ў «Bibliotece Warszawskiej». Праўда, тут змешчаны творы, якія ён ужо і раней друкаваў, як, напрыклад, вершаваная прымаўка пра караля Саса і некаторыя іншыя. Аднак знаходзім і новыя: «Варт Пац палаца, а палац Паца», «Пісаў на Бердычаў», «Дажылі палякі, ні хлеба ні табакі», «Кажды дудак мае свой чубак» і іншыя. Глыбіня і кваліфікаванасць каментарыяў да падборкі прыказак і прымавак сведчылі аб сталасці збіральніка як вучонага-фалькларыста.

Апошнія гады жыцця. Што ў нашай памяці

Паўстанне 1863–1864 гадоў закранула душу амаль кожнага беларускага інтэлігента, грамадскага дзеяча. Я. Тышкевіч прамога дачынення да гэтай гістарычнай падзеі не меў, ён толькі спачуваў яе ўдзельнікам. І толькі па гэтай прычыне мог апынуцца ў ліку рэпрэсіраваных. Ва ўсякім выпадку, калі Вільня апусцела ад удзельнікаў руху: хто загінуў, каго саслалі за Уральскі хрыбет, хто эмігрыраваў — наш грамадскі дзеяч сам пакінуў гэты культурны цэнтр і пасяліўся ў глухім мястэчку Біржы, на поўначы Жамойці.

Спачатку Я. Тышкевіч адчуваў сябе адлучаным ад сяброў, калег, ад навукі. Толькі пасупова да вопытнага вучонага зноў вярталася

жаданне працаваць. Ён бярэцца за даследаванне Біржаў. Праўда, яго захаплення гэтым мястэчкам хапіла толькі на адну публікацыю. Напэўна, ён адчуў далёкасць гэтага матэрыялу ад тых, якія замалада былі яму бліжэйшыя. Усё ж Я. Тышкевіч натхніў сваяка Язэпа Тышкевіча на стварэнне ў Біржах хатняй калекцыі старажытнасцей і дапамагаў яму ў вызначэнні прадметаў археалогіі[47]. Некалькі пазней прыклад Я. Тышкевіча будзе скарыстаны ў новым Тышкевічавым музеі ў Паланзе[48].

У Біржах Я. Тышкевіч закончыў немалую работу над кнігай-альбомам пра свой лагойскі радавод, якую падрыхтаваў да друку. Адначасова ён імкнуўся наладзіць сувязь з навуковымі цэнтрамі Варшавы і Кракава. Вучоны пастаянна сачыў за навінкамі археалагічнай літаратуры. З улікам навейшых адкрыццяў і дасягненняў эўрапейскай навукі ён спрабуе пераасэнсаваць і дапоўніць раней напісанае. У 1872 годзе выйшла яго кніга «Археалогія на Літве». Гэтая кніжка была па сутнасці творчым завяршэннем той напружанай, амаль 40-гадовай працы даследчыка. Сімвалічна тое, што Я. Тышкевіч пачынаў свой творчы шлях з археалогіі і ёю завяршыў жыццёвы кругабег.

Не толькі ў археалогіі пераасэнсоўвае свае канцэпцыі вопытны даследчык. Напрыклад, працу «Узоры хатняга сумеснага жыцця ў Літве», якая выйшла раней (1844), ён цяпер перапісвае і ў Варшаве яна выходзіць ужо ў новым варыянце. У ёй аўтар выкладае свае погляды на культуру шляхты ранейшых стагоддзяў, што жыла на тэрыторыі гістарычнай Літвы. Яўстах Тышкевіч не забыўся расказаць і пра духоўнае жыццё гэтага слоя грамадства. Ілюструе яго трапнымі беларускімі прыказкамі, прымаўкамі, а таксама змястоўнымі легендамі і паданнямі[49]. Апісаны ўзоры абрадаў, якіх прытрымлівалася шляхта. А вось у кнізе «Нашы старонкі»[50] Я. Тышкевіч нібы дзеля «аб'яднання» самых розных станаў грамадства роднай Барысаўшчыны з аднолькавай павагай піша пра жыццё селяніна, лекара, шляхціца і магната Радзівіла.

З часам сітуацыя ў краі некалькі змянілася, і Я. Тышкевіч зноў перабіраецца з Біржаў у любімую Вільню. Наладжвае новыя і падтрымлівае старыя сувязі з вучонымі Кіева, Масквы, Пецярбурга і

47Архіў Ленінградскага аддз. Ін-та археалогіі АН СССР, ф. 1, воп. 1 (1888 год), спр. 13а, арк. 240.

48Там цяпер працуе шырокавядомы музей бурштыну.

49Obrazy domowego pożycia na Litwie... S. 139, 145, 146, 169.

50Nasze Strony. Obrazek litewski przez E. Tyszkiewicza. W Krakowie. 1871.

сваімі беларускімі калегамі. І яго вопыт, яго веды спатрэбіліся. Так, Кракаўскае навуковае таварыства прапанавала яму, а таксама А.Кіркору і маладзейшаму В. Каратынскаму скласці слоўнік старажытнасцей краю. Але гэтая работа, на жаль, не была закончана.

Цяжкай стратай была для нашага героя смерць у 1868 годзе старэйшага брата Канстанціна, блізкага чалавека не толькі па крыві, але і па духу. Тыя, хто ведаў братоў бліжэй, заўважалі ў іх дзейнасці як вялікае падабенства, так і адрозненні. Калі ў старэйшага Тышкевіча спалучаліся агонь творчага парыву з развагай дапытлівага вучонага, то ў малодшага брата жыло пастаяннае, але спакойнае жаданне дзеянняў. Няспешнасць Яўстаха Тышкевіча некаторыя калегі прымалі за непаваротлівасць. Усё гэта чыстая ўмоўнасць. Як і Канстанцін, ён быў аддадзены навуцы, але што зробіш, калі навука «капрызная пані» і патрабуе шмат намаганняў, каб распазнаць яе таямніцы. Усё ж у іх жыцці і дзейнасці было шмат супольнага, блізкага, роднаснага.

Апошнія два гады жыцця Я. Тышкевіча складваліся драматычна. Многае з задуманага не здзейснілася. Слабела здароўе. Усімі прызнаны вучоны — сябра Дацкага каралеўскага таварыства аматараў паўночных старажытнасцей, Стакгольмскай Каралеўскай акадэміі выяўлегічага мастацтва і старажытнасцей, Лонданскага археалагічнага інстытута, ганаровы сябра Пецярбургскай Акадэміі навук, — у апошнія гады ён адчуваў сябе забытым, ва ўсякім выпадку, ён сам так думаў.

Даўнія сябры не забываліся адведваць шчырага рупліўца навукі, нажаль, і яны старэлі, хварэлі ды адыходзілі ў нябыт. Маладзейшыя спадкаемцы памяталі пра свайго духоўнага настаўніка і імкнуліся на спатканне з ім (М. Кусцінскі, А. Ельскі, Т. Саподзька). Адведаў слабеючага дзядзьку Яўстаха пляменнік Аскар Тышкевіч, які ўжо падаваў надзеі ў археалогіі. Усіх шматвопытны вучоны арыентаваў на даследаванне беларускіх старажытнасцей.

Апошнія дні жыцця Я. Тышкевіч правёў пад апекай сястры. Пры ёй ён і памёр[51].

Шмат людзей сабралася на пахаванне знакамітага чалавека,

51Падаем упершыню тэкст асобна надрукаванага лістка з паведамленнем аб смерці вучонага: «Августа 13 дня (1873 года. — Г.К. і А.К.) скончался в г. Вильне, после продолжительной болезни, граф Евстафий Пиевич Тышкевич, камер-юнкер Двора его императорского величества. Сестра покойного с душевным прискорбием извещает родных и знакомых, что вынос тела последует 14 сего августа в 6 часов по полудни из дома Огинского, что на Большой улице, на кладбище Росса, а заупокойная литургия и погребение 16 августа в 11 ч. утра. (Печатать дозволяется. 13 августа 1873 г. Виленской полиции полковник Федоров.)»

аддалі яго цела зямлі на прэстыжным месцы на Росах — на Літаратурнай горцы, поруч з яго аднадумцам Уладзіславам Сыракомлем. Спачатку былі вянкі, кветкі. Пазней на магіле клопатамі сястры Паўліны паставілі помнік з гербам «Ляліва». А неўзабаве ў друку з'явіліся некралогі, успаміны, словы памяці сяброў, калег. Усе сведчылі, што ў асобе Я. Тышкевіча навука страціла таленавітага даследчыка ў многіх галінах чалавеказнаўства, адзначалі, што грамадства страціла сапраўднага рыцара навукі.

Не ўсё ён паспеў апублікаваць, у рукапісах засталіся яго працы: «Зельнік барысаўскіх ваколіц», «Матэрыялы да нашай гісторыі», матэрыялы па археалогіі, збор гістарычных дакументаў і нават верш.

Вобраз Я. Тышкевіча застаўся на жывапісных палотнах, на гравюрах, медальёнах. Яшчэ ў 1850 годзе Рафал Слізень выканаў партрэт вучонага для медальёна. Потым над партрэтамі Я. Тышкевіча працавалі Л. Марачэўскі, А. Рагульскі, Л. Страус, Я. Дамель, У. Валькевіч і А. Пекжэт. Дарэчы, Люцыян Марачэўскі пасля смерці Я. Тышкевіча ў Пецярбургу адчаканіў медаль у яго памяць.

Я. Тышкевіч за сваё жыццё зрабіў вельмі шмат ў розных сферах народазнаўства: археалогіі, этнаграфіі, фалькларыстыцы, краязнаўстве, музеязнаўстве, мастацтвазнаўстве, ахове помнікаў, бібліятэчнай справе, тапаніміцы, мемуарыстыцы, народнай медыцыне, навуказнаўстве... Прыродай дадзены талент вучонага спалучаўся з выключнай працавітасцю і мэтанакіраванасцю. І калі ў нечым ён не паспеў давесці да канца задуманае, то гэта не яго віна. У рэшце рэшт, Я. Тышкевіч жыў у той час, калі толькі займаўся світанак беларускай навукі. І сёння як запавет чытаюцца словы сумленнага вучонага, сказаныя ім яшчэ ў маладыя гады: «Абавязак кожнага адукаванага і ўлюбёнага ў свой край чалавека старацца растлумачыць усё, што падпала пад сумненне і складае матэрыял для айчыннай гісторыі. Здагадвацца, шукаць, адкрываць, а адкрытае перадаваць людзям — значыць падаваць руку дапамогі тым, хто прысвяціў жыццё сваё і здароўе навукам для дабра грамадскага».

© OCR: Камунікат.org, 2016

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2016
© PDF: Камунікат.org, 2016